

АСЦЯРОЖНА: КІБЕРМАХЛЯРСТВА

МС

ЯК У 30-х ГАДАХ УЗДЗЕЙНІЧАЛІ НА ДЗЯЦЕЙ?

20-21



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЛІСТАПАДА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 227 (29341)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр БАЙГІН, галоўны ўрач Гродзенскай абласной станцыі хуткай дапамогі:**

*«Выездаў сапраўды шмат. У такім рэжыме раней даводзілася працаваць падчас эпідэміі грыпу. Адзначу, што робіцца ўсё, каб супрацоўнікі былі абароненыя, мы забяспечаны неабходнымі сродкамі індывідуальнай аховы, дэзінфекцыі. Ёсць і ўсё што трэба для аказання якаснай дапамогі пацыентам. Прыемна, што ёсць тыя, хто не застаецца абыякавы, падтрымлівае медыкаў. Гэта натхняе, дазваляе цалкам засяродзіцца на дапамозе хворым».*

## КОРАТКА

- Новыя стаўкі ўтылізацыйнага збору ўвядуць з 1 студзеня 2021 года.
- **«Белавія» аднаўляе палёты ў Ларнаку з 19 снежня.**
- У Гомелі адкрылі пункт пракату тэхсродкаў сацыяльнай рэабілітацыі.
- **Рэспубліканскі конкурс на найлепшую эмблему нацыянальнай сеткі «Здаровыя гарады і пасёлкі» праводзіцца ў Беларусі.**
- Беларускі Чырвоны Крыж ужо прыступіў да падрыхтоўкі традыцыйнай навагодняй акцыі «Ёлка жаданняў». Гэта штогадовая навагодняя дабрачынная кампанія па зборы падарункаў для дзяцей, сем'і якіх знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.
- **Міжнародны экалагічны кангрэс пройдзе 20—21 лістапада ў БДУ.**

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Культура павінна служыць народу»

## Новым міністрам культуры стаў Анатоль Маркевіч

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора прызначыў і ўзгадніў шэраг кандыдатур на новыя пасады ў дзяржаўным кіраванні. Акрамя Міністэрства культуры і падраздзяленняў МУС, новых кіраўнікоў атрымалі дыпламатычныя місіі ў Арменіі, Азербайджане, Кітаі, Пакістане і некалькіх афрыканскіх краінах. У старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта — новыя намеснікі.**

### Патрыёт і менеджар

Анатоль Маркевіч у 2019—2020 гадах працаваў памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Брэсцкай вобласці, да гэтага восем гадоў узначальваў Навагрудскі райвыканкам, працаваў на пасадзе намесніка старшыні Карэліцкага райвыканкама, дырэктарам базавых і сярэдніх школ, па адукацыі — настаўнік фізікі і матэматыкі.

Падчас прадстаўлення на пасаду новага міністра, Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што той па нацыянальнасці паляк.

СТАР. 2



Фота БелТА.

# Суседзі з вуліцы Навагрудскай



У аграгарадку Уселюб на вуліцы Навагрудскай пасяліўся новы гаспадар — Андрэй ГРОМАК — працавіты, клапатлівы, з умелымі рукамі чалавек, які хоча свой падворак зрабіць прыгожым, утульным, можна сказаць, узорным. Але найперш (да пачатку зімы) ён хоча ўсталяваць надзейную агароджу. Таму Андрэй Мікалаевіч у адной асобе і дызайнер, і архітэктар, і будаўнік. Побач з Андрэем жывуць пенсіянеркі Ніна КОМАР і Ганна ЕЎЧАР. Яны — сяброўкі. Цяперашні клопат жанчын — перасадка восеньскіх кветак — хрызантэм. І не толькі ў сваіх палісадніках — свайму суседу Ніна Міхайлаўна і Ганна Сямёнаўна таксама дапамагаюць упрыгожваць кветкамі двор.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Навагрудскі раён.*

Прыкметы часу



Фота БелТА.

# ЭФЕКТ МАСКІ

## Што кажуць псіхолагі аб тым, як неабходнасць закрываць палову твару змяняе наш свет

**За лета і цёплы верасень-кастрычнік многія паспелі забыць пра маскі. Здавалася, што мы пражылі гэта, як пражылі многае за апошнія паўгода. Кожны дзень падкідваў такія навіны, што ўспамінаць аб першай хвалі «кароны» і пра тое, як мы прывыкалі насіць маскі, проста не было калі. І вось яны вярнуліся ў наша жыццё — падобна, для таго каб трывала і прынамсі на некалькі месяцаў стаць яго абавязковым атрыбутам. На гэтым тыдні масачны рэжым уведзены на тэрыторыі ўсёй краіны.**

**Маскі з гэтага часу абавязковыя ў любых грамадскіх месцах: у крамах і гандлёвых цэнтрах, у кафэ і піцэрыі, у аптэцы і паліклініцы, пры наведванні пошты і банка, кіно і тэатра, пры паездцы ў метро або таксі. Нароўні з тэлефонам, кашальком і ключамі медыцынская маска цяпер павінна быць у кожнага, хто выходзіць з дому.**

СТАР. 4

# «Культура павінна служыць народу»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Напэўна, гэта ў дадзенай сітуацыі і добра, бо мы сапраўды інтэрнацыяналісты», — падзяліўся думкамі Аляксандр Лукашэнка.

Ён назваў рашэнне прызначыць чалавека з другой сферы дзейнасці нестандартным і растлумачыў свае матывы. Прызначыць кіраўніком сферы культуры чалавека збоку было вырашана ў сувязі з рэакцыяй на запыты работнікаў культуры, сказаў Прэзідэнт.

«Гэта ад многіх з іх прыйшло пажаданне: калі ласка, прызначце на гэту пасаду чалавека збоку, давайце паспрабуем, каб быў чалавек не нашага кола. Ну а я падумаў, што калі старшынёй выканкама працаваў, то добра ведае, што такое культура. Да таго ж па адукацыі — педагог. Педагог — гэта чалавек, які можа працаваць на любой пасадзе», — падзяліўся разважаннямі Аляксандр Лукашэнка.

Ён падтрымаў ідэю накіраваць у сферу перш за ўсё менеджара, які разам з тым разумее, што дзеячы культуры — гэта «суперэліта нашага грамадства». Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на задачы, якія стаяць перад новым міністрам, у тым ліку па ўрэгуляванні сітуацыі ў Купалаўскім тэатры. «Усё сыдзе, мы з вамі сыдзем з улады, з жыцця, а вось гэта брыдкая старонка застанецца на ўсё жыццё», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што марыў, каб Нацыянальны акадэмічны тэатр адпавядаў свайму статусу і знешне, і паводле зместу. Але «прыйшоў адзін нягоднік, прасіўся туды, кляўся, што будзе верны краіне, Айчыне і Прэзідэнту, і што атрымалася? Што здарылася з гэтай трупай? Я да чаго кажу: вось мы сыдзем, а гэта ганьба застанецца ў гісторыі беларускага народа як цяжкая пляма. Гэта ўжо нікуды не падзенеш. Як і тое, што ў нас адбываецца, дзякаваць богу, толькі ў Мінску, дзякаваць богу, толькі па нядзелях. Усе ж думаюць, што ў нас краіна перавярнулася, калі глядзяць інтэрнэт».

У кіраўніцтве сферы культуры, па словах Аляксандра Лукашэнкі, патрэбны патрыёт і чалавек, які здольны «навесці там парадак». «Я буду стаяць побач, буду рабіць усё, што трэба. За спінай, добра, буду за спінай, але нядобра, калі ў нас у краіне такія адносіны супрацоўнікаў культуры, кіраўнікоў і культработнікаў, артыстаў, акцёраў, рэжысёраў да краіны, — лічыць Прэзідэнт. — Можна мець любое меркаванне. Яны павінны мець сваё меркаванне, але закон нельга парушаць».

Тых, хто выступае «супраць гвалту», Прэзідэнт заклікаў пацярпець і паглядзець на тое, што адбываецца, праз час. «Вялікае бачыцца на адлегласці, вы зразумееце хутка, у чым тут сэнс, — сказаў ён. — Не. Яны ж выкацілі, выскачылі з гэтымі прэтэнзіямі ў той жа дзень. Значыць, унутры ў іх гэта ўжо было пасеяна, закладзена. Таму не трэба нікому вешаць лапшу на вушы, што гэта рэакцыя на нейкі гвалт. Вы ж павінны быць вытрыманымі. Вы ж твар нацыі. Таму, Анатоль Мечыслававіч (Маркевіч. — **«Зв.»**), гэты твар трэба вярнуць краіне. Гэта павінен быць сапраўды твар нацыі. Калі мы гэта не зробім — наша пакаленне, гэта будзе ганьбай і плямай на нашым пакаленні: мы стварылі суверэнную, незалежную Беларусь, а потым не змаглі яе ўтрымаць і іншым даказаць, што яна сапраўды наша».

Культура павінна служыць народу, яна павінна быць увасабленнем нашай дзяржавы, рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

### «Работа будзе накіравана на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны»

«Работа будзе накіраваная на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, на далейшае развіццё культуры, стварэнне і ўмацаванне добрых традыцый, якія існуюць у нашай сістэме ўстаноў культуры, і безумоўна, мы павінны працаваць над тым, каб раскрыць творчы патэнцыял нашых людзей, — расказаў журналістам пра тое, у чым бачыць сваю задачу, новы міністр культуры. — Вядома, культура і мастацтва з'яўляюцца тымі фактарамі, якія ўплываюць на далейшае развіццё адукацыі, сродкаў масавай інфармацыі, турызму, індустрыі забаў, але, на мой погляд, неабходна ўзмацніць ролю культуры ва ўсіх аспектах грамадскага жыцця. Гэта вельмі важна і вельмі актуальна».

Анатоль Маркевіч дадаў, што культуру і мастацтва трэба разглядаць як «пэўную накіраванасць у галіне рэальнага сектара эканомікі».

«Бо ў дадзенай сферы ствараюцца рабочыя месцы, якія вельмі актуальныя як для гарадской, так і для сельскай мясцовасці. І тут, безумоўна, мы павінны дакладна разумець, калі вядзём размову пра аптымізацыю ўстаноў: з аднаго боку — так, неабходна вельмі руплівa падыходзіць да выдаткавання бюджэтных сродкаў, але ў той жа час — даваць увесь неабходны пералік паслуг духоўнага развіцця насельніцтва нашай краіны», — паспрабаваў растлумачыць ён.

Па словах новага міністра культуры, у размове з кіраўніком дзяржавы была закранута і сітуацыя, якая склалася ў Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы.

«Мы трошкі закранулі гісторыю тэатра імя Янкі Купалы: колькі было зроблена з боку дзяржавы для таго, каб прывесці ў парадак дадзеную ўстанову, — сказаў ён. — І на сёння, вядома, мы бачым пэўную праблему, якая ўзнікла, але разам з тым упэўнены, што з калегамі, са спецыялістамі мы дэталёва яшчэ чарговы раз унікнем у стан спраў, і я думаю, і ўпэўнены, што тэатр Янкі Купалы зноў будзе радаваць нашага гледача, будзе прапаноўваць свой рэпертуар, які будзе дастойна прадстаўлены не толькі ў маштабах нашай дзяржавы, але і за яе межамі».

# «Вы людзі вялікага калібру»

**Былыя кіраўнікі сілавых ведамстваў — новыя паслы ў каўказскі рэгіён і Кітай.**

• Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў КНР стане Юрый Сянько, да гэтага — старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта.

• Кіраваць дыпламатычнай місіяй нашай краіны ў Азербайджане адправіцца Андрэй Раўкоў, экс-дзяржсакратар Савета бяспекі Беларусі, былы міністр абароны.

• Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Беларусі ў Арменіі прызначаны былы Генеральны пракурор Аляксандр Канюк.

• Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Ісламскай Рэспубліцы Пакістан — Андрэй Мяцеліца.

• У Кеніі, Танзаніі, Угандзе, Эфіопіі, Афрыканскім Саюзе, Праграмах ААН на навакольным асяроддзі і населеных пунктах нашу краіну будзе прадстаўляць супрацоўнік МЗС Павел Узяткін.

Прэзідэнт не стаў расказваць новым дыпламатам пра крокі, куды іх накіроўваюць, але публічна спытаў — магчыма, хтосьці не хоча ехаць паслом?

«Вы людзі, асабліва вы ўтрох (Канюк, Раўкоў і Сянько. — **«Зв.»**), вялікага калібру. Я гатовы, калі вы зараз скажаце, што хацелі б працаваць на іншых пасадах...»

Звяртаючыся да Юрыя Сянько, Прэзідэнт адзначыў, што Кітай — асаблівая краіна. «Яны заўсёды цэняць, калі «цяжкавагавіка» накіроўваем туды», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Усе прысутныя пацвердзілі, што з гатоўнасцю паедуць працаваць на новых пасадах.

«Шчыра кажу, калі бачыце сябе ў нейкай іншай галіне і хочаце там працаваць — хоць зараз, хоць праз год ці праз паўгода, калі вы выкажаце жаданне. Людзі павінны разумець, што гэта не пенсійная для вас работа і не работа, куды на ўзбочыну выкінулі людзей. Такіх людзей на ўзбочыну не выкідаюць», — дадаў кіраўнік краіны.

Наконт пасольскай пасады ў Азербайджане для Андрэя Раўкова Прэзідэнт сумняваўся — не зразумеюць, чаму ён генерала арміі, былога міністра абароны, накіроўвае ў рэгіён, дзе толькі скончылася вайна.

«Няма тут ніякага закулісся, мы з Азербайджанам падтрымліваем вельмі добрыя і блізкія адносіны. Ты гэты кірунак ведаеш. Думаю, мы павінны з Азербайджанам падтрымліваць добрыя адносіны. Ды і з Арменіяй не парываем адносін, у нас яны выдатныя. Падтрымлівайце гэтыя адносіны, рабіце так, каб нас ні ў чым не падазравалі. Гэтыя дзве рэспублікі ў будучым павінны жыць мірна», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Адносна маладых назначэнцаў на пасады паслоў Прэзідэнт заявіў, што яго падыходы да кандыдатур вядомыя.

Ён яшчэ раз нагадаў, што асноўная задача дыпламатаў — прасоўваць айчынны экспарт. Гэта актуальна і для каўказскага рэгіёна, і для Кітая, і для афрыканскага кантынента.

# «Не сорамна, што ў нас ёсць такая міліцыя»

**Начальнік ГУБАЗіК МУС Мікалай Карпянкоў прызначаны намеснікам міністра ўнутраных спраў — камандуючым унутранымі войскамі. Генерал-маёр Юрый Назаранка стаў першым намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам міліцыі грамадскай бяспекі. Андрэй Любімаў прадстаўлены на пасаду начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама.**

Па словах Прэзідэнта, сутнасць назначэнняў і перастановак — наданне большага значэння ў МУС сістэме грамадскай бяспекі.

«Тут нікто не павінен быць у крыўдзе з тваіх (міністра МУС. — **«Зв.»**) сённяшніх намеснікаў, першы асабліва. Тут няма такога, што мы камусьці не давяраем і гэтак далей. Проста зыходзячы з нашага вопыту, з сітуацыі ў краіне, апошніх падзей мы пераконваемся, што ў будучым кірунак грамадскай бяспекі для нас будзе найважнейшым кірункам работы нашай міліцыі. Таму мы падымаем статус намесніка і робім першым намеснікам генерала, які будзе курыраваць грамадскую бяспеку», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, вакансіі, што з'явіліся ў МУС, неабходна запаўняць маладымі, праверанымі кадрамі.

«Я абсалютна згодны, што гэтыя людзі праверaныя, паказалі, што яны сапраўдныя патрыёты і гатовы абараняць сваю Радзіму, нягледзячы на накаты, якія здзяйсняліся на нас і перадусім на ваенных і міліцыю. Яны гэта вытрымалі, і, яшчэ раз падкрэсліваю, не сорамна, што ў нас ёсць такая міліцыя», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

**Марыя ДАДАЛКА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Андрэй САВІНЫХ:
# «Гэта выглядае некалькі недарэчна на фоне навін аб выбарах у саміх ЗША»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй Савіных выступіў з заявай у сувязі з прыняццем Палатай прадстаўнікоў Кангрэса ЗША законапраекта «Аб суверэнітэце, правах чалавека і дэмакратыі ў Беларусі».**

«Рашэнне Кангрэса паказвае, што ЗША працягваюць дзейнічаць па інерцыі, шаблонна, выкарыстоўваючы звыклыя спосабы ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых краін, парушаючы іх суверэнітэт і прынцыпы міжнароднага права. Гэта выглядае некалькі недарэчна на фоне навін аб выбарах у саміх Злучаных Штатах Амерыкі», — сказаў Андрэй Савіных.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Блізкая ўлада

# ЗВАНОК НЕ ЗАСТАНЕЦЦА БЕЗ АДКАЗУ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, паператворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 21 лістапада, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Сяргей Віктаравіч ЛЯЎКОВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Парламенцкі дзённік

# НА ШЛЯХУ ДА ІНФАРМАТЫЗАЦЫІ

## Дэпутаты ў другім чытанні разгледзелі змяненні ў закон па пытаннях аховы здароўя і аказання псіхалагічнай дапамогі

**Згодна з навацыямі, пашырыцца аб'ём медыцынскай дапамогі замежнікам, якія пастаянна пражываюць у нашай краіне, і прадугледжваецца магчымасць яе аказання на бязвыплатнай аснове пацыентам, што лечацца і назіраюцца ў дзённых стацыянарах. Цэлая глава Закона «Аб ахове здароўя» прысвечана інфарматызацыі.**

«Мы кажам, што ў краіне пачне функцыянаваць цэнтралізаваная інфармацыйная сістэма, сфарміруецца адзіны архіў. У законапраекце разглядаецца, якія даныя зможам уносіць туды на кожнага пацыента. Пашырацца правы пацыента, каб ён сам сказаў, якія яго даныя ўносіць. Акрамя таго, кожны пацыент зможа заходзіць у свой асабісты кабінет і глядзець вынікі аналізаў, эпікрызы», — расказала **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Людміла МАКАРЫНА-КІБАК.**

У Беларусі таксама пачалі працаваць універсітэцкія клінікі, дзе павышаюць кваліфікацыю і праходзяць перападрыхтоўку медыцынскія кадры. Законапраект прапаноўвае аднесці гэтыя ўстановы да дзяржаўных.

У другім чытанні разгледзелі законы па пытаннях аплаты працы бюджэтнікаў, парадку і ўмовах накіравання ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі і знаходжання ў іх.

Таксама абмеркавалі навацыі ў «Закон аб грамадзянстве».

**Аляксей БЯГУН, начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС,** расказаў, што змяненні спросцяць працэдуру натуралізацыі асоб, якія маюць падставы для спрошчанага парадку набыцця грамадзянства. Гэта, напрыклад, замежнікі, якія знаходзяцца ў шлюбе з беларусамі і выхоўваюць сумесныя дзіця. Больш просты стане працэс набыцця грамадзянства па праве месца нараджэння для непаўналетніх замежных грамадзян, што з'явіліся на свет у Беларусі. Адна з найбольш важных навацый — скарачэнне да пяці гадоў тэрміну пражывання ў краіне, каб асоба мела права падаць хадатайніцтва аб атрыманні грамадзянства.

«Таксама ўводзіцца абсалютна новы для нас інстытут — так званая працэдура аднаўлення ў грамадзянстве Рэспублікі Беларусь у адносінах да той катэгорыі беларусаў, якія страцілі яго па мінулай рэдакцыі закона (калі да 2002 года атрымлівалі замежнае грамадзянства). Для іх цяпер будзе прадугледжвацца магчымасць пры вяртанні на сталае жыхарства ў Беларусь аднавіцца ў нашым грамадзянстве без выхаду з мінулага грамадзянства», — сказаў Аляксей Бягун. Ён пракаментаваў рэзанансныя папраўкі ў дакумент аб пазбаўленні грамадзянства. Маецца на ўвазе пазбаўленне яго толькі замежнікаў і асоб без грамадзянства, якія атрымалі беларускае грамадзянства і здзейснілі тэрарыстычны акт ці былі ўцягнутыя ў экстрэмісцкую дзейнасць.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**• У тэму**

У пачатку пасяджэння старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка пералічыў найбольш актуальныя задачы для парламентарыяў на бягучай сесіі. Сярод іх — падрыхтоўка да Усебеларускага народнага сходу. Дэпутатам неабходна завяршыць абагульненне прапаноў, якія паступілі ў Палату прадстаўнікоў, і накіраваць іх у аргкамітэт па падрыхтоўцы форуму.

«Разам з тым той шырокі дыялог, які вядзецца ў цяперашні час на розных дыскусійных платформах з удзелам парламентарыяў, павінен працягвацца. Трэба ўцягнуць у гэты працэс як мага больш беларусаў, бо менавіта такім чынам кожны грамадзянін можа сёння аказаць рэальны ўплыў на прыняцце рашэнняў, якія маюць прынцыповае значэнне для будучыні краіны», — сказаў спікер ніжняй палаты парламента.

Па яго словах, неабходна выслухаць усіх удзельнікаў дыялогу незалежна ад іх палітычных перакананняў, гэта тым больш важна, што арганізатары беспарадкаў актыўна штурхаюць людзей на радыкальныя дзеянні. «Іх першапачатковая стаўка была зроблена на раскол улады. Жорсткі псіхалагічны ціск адчулі прадстаўнікі многіх дзяржаўных органаў, у тым ліку і парламентарыі. Але калі гэты план не спрацаваў, яны пераключыліся на іншыя, не менш брудныя метады вядзення інфармацыйнай вайны. Кампанія па дыскрэдытацыі дзяржаўных сімвалаў прывяла да гібелі чалавека. Але праваахоўнікі ўжо зараз з гэтага мала. Яны ўжо спрабуюць уцягнуць у канфлікт вернікаў і расправіць рэлігійную варожасць», — лічыць Уладзімір Андрэйчанка.

Ён адзначыў, што краіна па-ранейшаму нацэлена на ўмацаванне сувязяў з усімі замежнымі партнёрамі. «Але важна, каб яны выразна разумелі — нам не патрабуецца ні прызнанне вынікаў выбараў, ні ацэнак дзеянняў дзяржавы па забеспячэнні правапарадку ў краіне. Беларусы самі ва ўсім разбяруцца. Мы гатовыя да канструктыўных адносін, калі гаворка ідзе не пра надуманыя праблемы, а пра рэальныя праекты, якія будуць працаваць на карысць народаў нашых краін», — дадаў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Энергетыка

# БелАЭС ізноў запусцілі

**Пасля 11-дзённага перапынку ў рабоце і замены трансфарматараў напружання ў вымяральных ланцугах генератарнага выключальніка, а таксама выпрабаванняў цеплаэнергетычнага абсталявання і неабходных вымярэнняў і даследаванняў першы энергаблок БелАЭС уключылі ў сетку, паведамляецца на сайце Мінэнерга.**

Нагадаем, што пасля падключэння першага блока да энергасеткі краіны 3 лістапада ён быў выведзены на 42 % магутнасці рэактарнай установкі. За тры дні, пакуль рэактар выпрацоўваў энергію, Беларусь паспела сэканоміць каля мільёна долараў, якія маглі б пайсці на куплю газу.

8 лістапада рэактар адключыла сістэма электрычнай абароны. Гэта здарылася з-за таго, што ў выніку ўнутранага кароткага замыкання са строю выйшлі італьянскія трансфарматары напружання з вымяральнай схемы абароны блочнага трансфарматара, растлумачылі ў дзяржкарапарцыі «Расатам», якая займаецца будаўніцтвам станцыі, і паабяцалі замяніць іх на расійскія. Сітуацыю тады назвалі некрытычнай і абсалютна рабочай для этапу ўводу блока ў эксплуатацыю. Хоць адключэння энергаблока, вядома, ніхто не планаваў. Эксперты запэўнілі, што радыяцыйны фон на пляцоўцы ў норме і па міжнароднай шкале МАГАТЭ мае нулявы ўзровень.

Мінэнерга паведамляе, што ўключэнне ў энергасетку і набор нагрузкі праведзены адпаведна з патрабаваннямі тэхрэгламенту бяспечнай эксплуатацыі без нараканняў. Рэактар працуе на магутнасці 40 % ад намінальнай. Выпрабаванні сістэм і абсталявання энергаблока працягваюцца.

**Ірына СІДАРОК.**

Надвор'е

# У нядзелю пойдзе снег

## Месцамі без прыстаўкі «мокры»

**Вось і нас «зачэпіць» ураган «Эта». Гэта ён бушаваў на мінулым тыдні каля ўсходніх берагоў Паўночнай Амерыкі, потым страціў актыўнасць і ператварыўся ў цыклон, які цяпер знаходзіцца над Батнічным залівам. Менавіта гэты цыклон і фарміруе надвор'е ў большасці дзяржаў Еўропы. У нашай краіне яго ўплыў адлюструецца ва ўзмацненні паўднёва-заходняга ветру і паступленні адносна цёплага паветра, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Дык вось, сёння франтальны раздзел ад цыклону стане фарміраваць надвор'е ў Беларусі. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Амаль усюды кароткачасовыя ападкі, у асноўным дажджы.

У суботу надвор'е пачне мяняцца — да абеду мы трапім у вобласць павышанага атмасфернага ціску, якая была сфарміравана ў прахалоднай паветранай масе, таму будзе пераважна без ападкаў. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Вецер заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад нуля да мінус 5 градусаў, удзень яна будзе ў межах ад мінус 1 градуса да 5 цяпла.

А ў наступныя суткі нас чакае не зусім ласкавае надвор'е. У гэты дзень (у нядзелю) з Заходняй Еўропы чакаецца перамяшчэнне франтальных раздзелаў. Зноў павялічыцца і ўшчыльніцца воблачнасць, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, які месцамі будзе пераходзіць у дождж. Чакаецца слабы галалёд, на дарогах месцамі галалёдзіца.

Увага! Вецер паўднёва-заходні парывісты, у асобных раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень яна будзе вагацца ад нуля да 7 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня захаваецца актыўная цыклонічная дзейнасць у Паўночнай Атлантыцы, і надвор'е будуць фарміраваць яе атмасферныя франты. У панядзелак часам пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу, уначы па ўсходзе з мокрым снегам. Вецер будзе заходні ўмераны. Месцамі магчымы слабы туман, уначы па ўсходзе — слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 1 градуса да 6 цяпла, удзень — 3—8 градусаў вышэй за нуль.

У аўторак яшчэ больш пацяплее. Уначы на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Вецер чакаецца паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе вагацца ад нуля да плюс 5 градусаў, у сярэдзіне дня па паўднёвым захадзе краіны пацяплее да плюс 7 градусаў. Эксперты па надвор'і адзначаюць, што такі тэмпературны фон будзе на 2-4 градусы перавышаць кліматычную норму, але гэта ўжо адпавядае тэмпературы пачатку лістапада.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Вялікабрытанія рэкордна павялічвае выдаткі на абарону

Каралеўства плануе павялічыць абаронныя выдаткі на 16,5 мільярда фунтаў стэрлінгаў на працягу наступных чатырох гадоў. Гэта рэкордная сума за апошнія 30 гадоў. Яна вылучаецца дадаткова да ўжо існуючага абароннага бюджэту. «Паводле ацэнак, усё гэта павялічыць агульны аб'ём фінансавання на працягу чатырох гадоў на 24,1 мільярда фунтаў стэрлінгаў у параўнанні з мінулым бюджэтам», — адзначаецца ў паведамленні брытанскага ўрада. «Я прыняў гэтае рашэнне ў разгар пандэміі, таму што абарона дзяржавы павінна быць вышэй за ўсё», — заявіў прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Борыс Джонсан. Паводле яго слоў, сітуацыя ў свеце становіцца ўсё больш небяспечнай і больш канкурэнтнай, чым калі-небудзь з часоў халоднай вайны, у сувязі з чым узнікла неабходнасць у сур'ёзнай мадэрнізацыі абароннай галіны. Урад адзначыў, што Вялікабрытанія становіцца лідарам па абаронных выдатках сярод краін Еўропы і другой дзяржавай пасля ЗША па гэтым паказчыку ў НАТА.

### Boeing 737 Max атрымаў дазвол на палёты ў ЗША



Рэгулятары грамадзянскай авіяцыі ЗША зноў дапусцілі да палётаў авіялайнер Boeing 737 Max, які пасля дзвюх катастроф у Інданезіі і Эфіопіі быў часова зняты з эксплуатацыі ў сакавіку 2019 года. Фінансавыя цяжкасці кампаніі Boeing павялічыліся ў сувязі з пандэміяй, якая прывяла да рэзкага скарачэння авіяперавозак ва ўсім свеце. Зрэшты, перш чым Boeing 737 Max зноў зможа падняцца ў паветра, самалёты павінны быць мадыфікаваныя, у іх канструкцыю неабходна ўнесці рэкамендаваныя змены. Як сказана ў заяве Федэральнага ўпраўлення грамадзянскай авіяцыі ЗША (FAA), дазвол не азначае неадкладнага вяртання самалёта ў неба. Акрамя замены праграмнага забеспячэння і праводкі, спатрэбіцца таксама перавучыць пілотаў. Як запэўнівае FAA, патрабаванні да змены канструкцыі дазваляюць ліквідаваць прычыны, якія прывялі да катастроф.

### Улады Германіі выдзеляць аўтамабільнай прамысловасці яшчэ 3 млрд еўра

Пра гэта гаворыцца ў заяве афіцыйнага прадстаўніка ўрада Штэфэна Зайберта. У выніку агульны аб'ём падтрымкі аўтавытворцаў складзе каля 5 мільярдаў еўра, адзначыла Tagesschau. Зайберт абгрунтаваў неабходнасць выдзялення сродкаў «доўгатэрміновымі структурнымі зменамі», якія, па яго словах, спалучаныя з «вялікімі цяжкасцямі». У той жа час ён адзначыў, што «пасля рэзкага падзення продажаў у першым паўгоддзі» галіна цяпер дэманструе «першыя прыкметы аднаўлення», паведаміла Deutsche Welle. З абвешчанай сумы 1 млрд еўра паступіць у так званы фонд будучай аўтамабільнай прамысловасці, які прызначаны для фінансавання сярэднетэрміновых і доўгатэрміновых стратэгій трансфармацыі гэтага сектара. Берлін яшчэ ўлетку падоўжыў да канца наступнага года кампенсацыйныя выплаты пакупнікам аўтамабіляў з электрычнымі і гібрыднымі рухавікамі, цяпер жа вырашана падоўжыць іх да 2025 года.

# ЭФЕКТ МАСКІ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Калі задумацца, нічога звышнатуральнага. Калісьці для дам лічылася непрыстойным выходзіць з дому без капялюшыка і пальчатак. А да гэтага мужчыны і жанчыны насілі парыкі. І нашэнне маскі — гэта проста новы этыкет. Пагадзіцеся, у сучасным грамадстве сёлета маска стала своеасаблівай адзнакай адукаванага, сацыяльна адказнага чалавека. Яна «раскажа», што вы клапоціцеся пра сваё здароўе і для вас важнае таксама здароўе суграмадзян, што выпадкова ці не апынуліся побач з вамі. Акрамя таго, яна спрыяе зніжэнню панікі — калі хтосьці баіцца захварэць, медыцынскія маскі на тварах навакольных падораць яму адчуванне большай бяспекі і кантролю над сітуацыяй.

Пры гэтым на пытанне, ці сапраўды маска здольная абараніць ад «ковіда» і больш традыцыйных рэспіраторных захворванняў, медыкі не адказваюць адназначна «так». Сусветная арганізацыя аховы здароўя папярэджвае, што медыцынская маска не здольная на 100 % абараніць чалавека ад вірусная інфекцыі. Яна затрымлівае часцінкі сліны, у якой могуць быць мікробы. Але ж вірус трапляе ў арганізм чалавека не толькі праз рот, але і праз вочы, ранкі і мікратрэшчыны на скуры, брудныя рукі. Ды і маскай трэба яшчэ ўмець карыстацца. Каб ахова была трывалая, медыцынскую маску трэба мяняць кожныя дзве гадзіны (што робіць далёка не ўсе), а аксесуар з тканіны — яшчэ часцей (выкарыстаны — мыць ў гарачай вадзе з мылам). Так што медыцынская маска ў першую чаргу служыць напамінам пра тое, што варта вытрымліваць сацыяльную дыстанцыю, часцей мыць рукі і не чапаць імі нос і рот. Больш эфектыўную абарону даюць рэспіратары, але іх на нашых вуліцах пакуль няшмат. Зрэшты, маскі абараняюць не настолькі надзейна, як хацелася б, або не, але насіць іх трэба — горш не будзе. Тым больш што «бязмасачнага» наведвальніка цяпер могуць настойліва папрасіць пакінуць тую ці іншую ўстанову. За масачны рэжым у арганізацыях адказваюць кіраўнікі ўстаноў, і калі імі будзе прынята адпаведнае рашэнне, чалавека без маскі могуць і не абслужыць.






Ну, а псіхолагі кажуць аб тым, што неабходнасць для ўсіх і кожнага з'яўляцца ў грамадстве з закрытым тварам змяняе наш свет...

## ДА ЛЕПШАГА...

Уласна кажучы, маска як штодзённая дэталь «адзення» ўжо даўно стала нормай для многіх вялікіх гарадоў Азіі — у адным такім горадзе, як вядома, можа жыць больш людзей, чым ва ўсёй Беларусі. Яшчэ да «ковіднага» 2020 года людзі хадзілі ў масках у мегаполісах Кітая, Японіі, Тайланда, у Тайвані і ў Ганконгу. Псіхолагі кажуць, што неабходнасць нашэння масак цягне за сабой шэраг станоўчых перамен.

● ***Правільнае дыханне.*** Эфект не зусім з вобласці псіхалогіі, хутчэй, з вобласці медыцыны. У нашым сырым і вільготным клімаце людзі з прычыны частай заложанасці носа з дзяцінства прывыкаюць дыхаць ротам. Частае ж нашэнне маскі спрыяе аднаўленню правільнага насавога дыхання: дыхаць ротам у масцы папросту нязручна. Насавое дыханне натуральным чынам паляпшае самаадчуванне і станоўча ўплывае на здароўе. Дзякуючы яму больш эфектыўна забяспечваецца кіслародам мозг (знікаюць мігрэні і некаторыя неўралагічныя праблемы), вентылююцца насавыя пазухі (зніжаецца верагоднасць развіцця гаймарытаў і сінусітаў), а таксама слыхавая труба і сярэдняе вуха (скарачаецца рызыка атытаў).

● ***Больш эфектыўная праца.*** Маскі ўплываюць на рацыянальнае выкарыстанне рабочага часу, адзначаюць псіхолагі.

— Неабходнасць нашэння масак у працоўных калектывах прыводзіць да таго, што людзі менш адцягваюцца на староннія размовы, флірт, сумесныя кава-паўзы, — кажа **сямейны псіхолаг Кацярына АЛЁХІНА.** — Такім чынам нашэнне масак уплывае на павышэнне выніковасці работы калектыву. Людзі засяроджваюцца на працоўных задачах і выконваюць іх больш хутка і якасна.

● ***Упэўненасць у сабе.*** Не сакрэт, што прыгожым людзям жывецца лягчэй, чым тым, каму не пашанцавала са знешнасцю. Яшчэ адзін «не сакрэт» — у тым, што Бог няроўна дзеліць: камусьці дастаюцца белыя зубы і правільныя рысы твару, камусьці — знешнасць «на аматара». І нават калі вам пашанцавала, старэнне нікога не шкадуе. Апошнія дзесяцігоддзі (нягледзячы на заклікі да бодзіпазітыву, «натуральнага старэння» і наогул умення «палюбіць сябе такой, якая ты ёсць»), прайшлі пад знакам імкнення да маладосці і знешняй дасканаласці. Жанчыны рознага ўзросту адбельвалі зубы, мянялі форму вуснаў і змагаліся з насагубнымі зморшчынамі пры дапамозе ін'екцый прыгажосці. Мужчыны ўсё часцей наведвалі касметалагічныя кабінеты і падстрыгалі дагледжаныя барodкі і вусы ў барбер-шопах. Маскі паказалі, што ўсё гэта — мітусня і марнасць.

— Можна выказаць здагадку, што нашэнне масак паступова скароціць колькасць комплексаў з-за знешнасці, — падкрэслівае **гештальт-тэрапеўт Алена ЧАРНЫХ.** — Маска шмат у чым ураўноўвае людзей з рознымі знешнімі данымі, і гэта безумоўны плюс.

● ***Павышэнне адаптыўнасці.*** Маска дае магчымасць быць больш натуральнымі ў соцыуме — яна зніжае ўзровень трывогі, паколькі дадае прыватнасці. Даследчыкі пішуць, што маска падсвядома асацыюецца з safe space (ад англ. «абароненая прастора»), якая засцерагае ад небяспекі навакольнага свету. Такім чынам, нашэнне маскі павышае псіхалагічную пластычнасць і адаптыўнасць, асабліва ў некаторых напружаных сітуацыях, напрыклад, на экзамене, на сумоўі пры прыёме на работу, пры выступленні перад незнаёмай аўдыторыяй і г. д.

● ***Рост самаацэнкі.*** Кожны нармальны чалавек хоча думаць аб сабе, што ён добры і харошы. Сумленны, надзейны, адказны. Надзяваючы маску перад тым, як адправіцца ў грамадскія месцы, чалавек такім чынам клапоціцца пра іншых — гэта ўносіць уклад у яго станоўчую самаацэнку і дазваляе думаць пра сябе як пра добрага чалавека, адзначаюць псіхолагі.

● ***Адмова ад курэння.*** Паліць пры наяўнасці маскі нязручна — кожны раз, перш чым сунуць у рот цыгарэту, маску трэба здымаць. А пах тытунёвага «перагару» (непрыемны не толькі для людзей, якія не кураць, але і для курца), які «пасяляецца» ў масцы на твары, адчуваецца вельмі востра. І гэта, як адзначаюць псіхолагі, цалкам можа падштурхнуць да цвёрдага рашэння адмовіцца ад цыгарэт.

## ...І ДА ГОРШАГА

Ёсць культуры, дзе спрадвеку прынята хаваць твары. Для славянскай культуры ўтойваць твар ніколі не было характэрна. Раней мы жылі сярод людзей з адкрытымі тварамі. Гэты год змяніў сітуацыю. І нашэнне масак, на думку некаторых псіхолагаў, цягне за сабой таксама і шэраг негатыўных наступстваў.

● ***Людзі горш разумеюць маўленне суразмоўцы...***

Камунікатыўны феномен «Эфект МакГурка» ўпершыню быў апісаны ў 1976 годзе. Нейрабіёлагі адкрылі эфект, калі для некага рух вуснаў іншага чалавека не супадае з тым, што ён на самай справе кажа. З-за гэтага тое, што гаворыць адзін чалавек, і тое, што чуе другі (адрасат выказвання), зусім не супадаюць. Нашэнне масак не пакідае магчымасці для суразмоўцы бачыць рух вашых вуснаў — і гэта можа ўскладніць зносіны і зрабіць цяжкім данясенне сваіх думак. З аднаго боку, маска не дазваляе чытаць па вуснах і апрацоўваць невербальныя сігналы, якія пасылае суразмоўца. З другога, прыглушае голас — і гэта таксама абцяжарвае зносіны.

— Асабліва сур'ёзныя цяжкасці ў сувязі з нашэннем маскі адчуваюць людзі, што слаба чуюць. Яны прывыклі спадзявацца ў тым ліку на чытанне па вуснах, — адзначае Кацярына Алёхіна.

● ***...І наогул горш разумеюць адно аднаго.***

Як ужо гаварылася, маска абцяжарвае счытванне невербальных сігналаў з твару суразмоўцы. Без маскі рух вуснаў і твар у цэлым выдаюць настрой і перажыванні чалавека, які размаўляе з вамі. Але калі твар да вачэй закрыты, вызначыць пачуцці суразмоўцы становіцца больш складана. Твары здаюцца раўнадушнымі, і пра пачуцці, якія хавае «покер-фэйс», даводзіцца толькі здагадвацца.

● ***Маска служыць напамінам, што чалавек чалавеку — прыхаваная пагроза.*** Некаторыя псіхолагі выказваюць занепакоенасць тым, што нашэнне масак (калі гэта стане нормай на гады і дзесяцігоддзі) з цягам часу можа спрыяць не толькі фізічнаму дыстанцыяванню людзей, але і псіхалагічнаму адчужэнню. Бо маска на твары іншага чалавека — напамін і сігнал, што гэты іншы можа прадстаўляць патэнцыйную небяспеку. Але гэтая думка — вельмі спрэчная.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

Супрацоўніцтва

# СОНЕЧНАЯ ЭНЕРГЕТЫКА, БІЯТЭХНАЛОГІІ І МЕДЫЦЫНА

**Маладыя вучоныя Беларусі і Кітая актыўна ўдзельнічаюць у сумесных інавацыйных праектах. Пра гэта паведаміў на цырымоніі адкрыцця VII Беларуска-кітайскага маладзёжнага інавацыйнага форуму «Новыя гарызонты — 2020» старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі Аляксандр ШУМІЛІН.**

«Адукаваная і прадпрымальная моладзь — студэнты, магістранты, маладыя навукоўцы — актыўна працуюць над інавацыйным развіццём Беларусі і Кітая, удзельнічаюць у сумесных праектах, спрыяюць пашырэнню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва дзвюх краін. Мы мэтанакіравана садзейнічаем узаемадзеянню паміж маладымі наватарамі Беларусі і Кітая, падтрымліваем для гэтага цэлы шэраг мерапрыемстваў, у тым ліку форум «Новыя гарызонты — 2020» і Беларуска-кітайскі маладзёжны конкурс навукова-даследчых і інавацыйных праектаў», — сказаў Аляксандр Шумілін.

Паводле яго слоў, колькасць сумесных беларуска-кітайскіх праектаў у 2019—2020 гадах павялічылася на чвэрць у параўнанні з папярэднім двухгадовым цыклам. Акрамя таго, іх тэматыка стала больш разнастайнай. Дзейсныя праекты ахопліваюць электроніку і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, механіку і інжынерыю, энергаэфектыўнасць і энергазберажэнне, транспартныя сістэмы, матэрыялазнаўства, металургію, біятэхналогіі, хімію, аграрныя тэхналогіі.

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях падкрэсліў, што выкананыя раней сумесныя праекты прынеслі практычныя вынікі. Напрыклад, распрацаваныя сумесна з Харбінскім політэхнічным універсітэтам высокаэфектыўнае абсталяванне і тэхналагічныя працэсы выкарыстоўваюцца ў навукова-тэхналагічным парку БНТУ «Палітэхнік» і ў ТАА «Полімедтэх» пры вытворчасці медыцынскіх вырабаў для здароўя і аховы здароўя, кардыялогіі, сасудзістай хірургіі і стаматалогіі. У выніку сумеснага праекта тэхнапарку БНТУ «Палітэхнік» і Ланьчжоўскага тэхналагічнага ўніверсітэта распрацаваны схемы і рэжымы халоднага звышгукавога напылення з максімальнымі тэхніка-эканамічнымі паказчыкамі. Яны выкарыстоўваюцца пры выкананні заказаў прамысловых прадпрыемстваў Беларусі.

Беларусь і Кітай актыўна ўзаемадзейнічаюць і па лініі развіцця суб'ектаў інавацыйнай інфраструктуры. Ужо створана прадпрыемства па вытворчасці абсталявання для сонечнай энергетыкі ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень», а таксама навучальны выпрабавальны цэнтр на базе сумеснага інстытута БДУ і Даляньскага політэхнічнага ўніверсітэта. Працягваецца работа па стварэнні Кітайска-беларускага цэнтра супрацоўніцтва ў галіне трансфармацыі навукова-тэхнічных дасягненняў на тэрыторыі «Вялікага каменя».

У рамках форуму прайшла прэзентацыя маладзёжных навукова-даследчых і інавацыйных праектаў у вобласці індустрыі 4.0, механікі і новых матэрыялаў, лічбавай сацыялізацыі, агратэхнікі агратэхналогій і харчовай бяспекі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Камандар МАДЖЫДАЎ:

# «У МЯНЕ ПАЎКРАІНЫ «СЫНОЎ»

## Алімпійскі чэмпіён, які бараца ўсё жыццё

**«Я нарадзіўся ў Грузіі, там вучыўся, служыў у войску. Але дзеля спартыўнай кар'еры пераехаў у Беларусь, бо беларуская школа барацьбы была адной з найлепшых у СССР. І тут я сфарміраваўся як спартсмен. Дзякуючы беларускай школе, беларускім людзям я сябе рэалізаваў і стаў асобай», — расказвае алімпійскі чэмпіён 1988 года Камандар Маджыдаў. Яго імя і беларуская барацьба — паняцці непадзельныя. Сёння заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь узначальвае Беларускую федэрацыю барацьбы. Легендарны барэц расказаў «Звяздзе», як гэта — быць героем спорту.**



***— Камандар Бафаліевіч, калісьці Васіль Рудніцкі, які адказваў за навуковую падрыхтоўку савецкіх барцоў, адзначаў, што ў вас дзіўны арганізм, здольны вытрымліваць вялізныя нагрузкі і хутка аднаўляцца. У чым сакрэт?***

— Канешне, вялікі дзякуй бацькам за здароўе, за генетыку. Але нават самы дзівосны арганізм трэба пастаянна развіваць і над ім працаваць. Без працавітасці ў гэтым выпадку нельга. Неабходна пастаянна працаваць над фізічнай і псіхалагічнай формамі. Толькі ў гэтай звязцы можна дабіцца поспеху. Як казаў наш галоўны трэнер зборнай Генадзь Сапуноў: «Што такое талент? Ёсць здольнасці, а калі здольнасці развіваюцца, то гэта ўжо талент».

***— Са спартыўнай гісторыі вядома, што трапіць у зборную Савецкага Саюза было вельмі складана. Азіраючыся назад, як вы лічыце, што вам дапамагло?***

— У першую чаргу жаданне і ўпартасць. І вельмі дапамагала тое, што мы раўняліся на сваіх куміраў. У дзяцінстве я, можа, і мала ведаў пра барацьбу, але сачыў за ёй. Я нарадзіўся ў Грузіі, якраз тады ў росквіце была кар'ера легендарнага барца Рамана Руруа, алімпійскага чэмпіёна, чатырохкратнага чэмпіёна свету. Потым я даведаўся пра Мікалая Балбошына, ён і стаў маім галоўным кумірам. І, аказаўшыся з ім у адной камандзе, не мог паверыць, што гэта адбываецца на самай справе. На свой першы збор у Алушту я паехаў, калі яшчэ не ўваходзіў у зборную, мяне проста камандзіравалі павучыцца. І там я прывязаўся да Мікалая Фёдаравіча. Помню, бяжым крос, ён 100 кг, я — 62, але бяжым як роўныя. Дабеглі да мора, ён нырнуў, я — за ім, а на вуліцы лістапад. Але і гэта не спыніла, так я цягнуўся за сваім кумірам, як і ўсе мае равеснікі.

**«Дабеглі да мора, ён нырнуў, я — за ім, а на вуліцы лістапад. Але і гэта не спыніла, так я цягнуўся за сваім кумірам».**

***— Як вядома, у 1984 годзе Савецкі Саюз байкатаваў Алімпійскія гульні ў Лос-Анджэлесе. Як гэта — спартсменам не паехаць на галоўныя спаборніцтвы?***

— Навіна аб тым, што на Алімпіяду мы не едзем, заспела нас у Сочы на зборы, дзе мы старанна рыхтаваліся. Канешне, для любога спартсмена — гэта ўдар, асабліва для ўзроставых спартсменаў. У мяне гэта павінна была быць першая алімпіяда, што крыўдна. Але на альтэрнатыўных спаборніцтвах «Дружба-1984» барацьба была мацнейшая, чым на Алімпійскіх гульнях. Там перамаглі я і яшчэ тры беларускія барцы.

***— Да Алімпійскіх гульняў 1988 года вы толькі аднойчы былі чэмпіёнам Савецкага Саюза, але ў Сеул паехалі і гэта пры высокай канкурэнцыі. Як так выйшла?***

— У 1988 годзе на чэмпіянаце СССР я ўвогуле быў другі. Але ў галоўнага трэнера Генадзя Сапунова меўся свой крытэрый: на ўсіх турнірах ён уважліва назіраў, як мы выглядаем у схватцы з замежнымі барцамі. І вырашыў, што я дастойны выступаць на Алімпіядзе. А там ужо атрымалася, што «прыйшоў, убачыў, перамог». Я быў вельмі зараджаны на гэтыя Алімпійскія гульні і гатовы на 100 %. Кантрольны збор мы праводзілі ў Хабараўску, зразумела, што трэнер сачыў за нашымі трэніроўкамі. І аднойчы я сказаў яму: «Генадзь Андрэевіч, вы нас не чапайце, мы выйграем, а вы іншымі спартсменамі займіцеся». Ён заўжды называў нас сваім дэсантам, маўляў, «куды іх ні кінь, любое заданне выканаюць і жывымі вернуцца».

***— Балгарын Жыўка Вангелаў быў вашым неразлучным сапернікам?***

— Так, мы пастаянна з ім змагаліся ў вырашальных схватках, і на «Дружбе-1984», і на Алімпійскіх гульнях. Але, што цікава, я сябрую з усімі, з кім бароўся, у мяне ёсць сябры з усяго свету. Хоць мы пастаянна ў схватках, барацьба вельмі дружны спорт. Так заўсёды было: на дыване — сапернікі, за яго межамі — сябры. Гэта лагічна, выступленні рана ці позна заканчваюцца, а жыццё працягваецца. А як жыць без сяброў?

**«Перада мной не стаяла задача задавольваць свае амбіцыі, мне было важна ўзбадзёрыць каманду. Гэта было нялёгка, прыйшлося сагнаць амаль 10 кілаграмаў вагі, нагадалі аб сабе былыя траўмы...»**

***— Камандар Бафаліевіч, вы не лічыце, што рашэнне стаць галоўным трэнерам зборнай адразу пасля заканчэння спартыўнай кар'еры было своеасаблівай авантурай?***

— Напэўна, пагаджуся, але так складаліся абставіны. У 1993 годзе ў канцы маёй спартыўнай кар'еры я стаў трэцім на чэмпіянаце Еўропы, другім — на чэмпіянаце свету. Трэба было вырашаць, што рабіць далей, і якраз ад Міністэрства спорту паступіла прапанова ўзначаліць зборную. Узяў два дні на падумаць і вырашыў, што варта паспрабаваць. Я прайшоў школу зборнай, са мной працавалі вялікія трэнеры, і пэўныя веды ў мяне былі. Канешне, былі моманты, калі я адчуваў нехватку вопыту. Але мне дапамагалі больш вопытныя трэнеры, і я многаму ад іх навучыўся. Ніколі не трэба баяцца вучыцца новаму. Ды і прыроджаная інтуіцыя значна дапамагала.



***— У барацьбе патрэбна інтуіцыя?***

— У барацьбе без інтуіцыі нікуды, асабліва трэнеру. Ён павінен быць не толькі настаўнікам, але і мамай, татам, ён замяняе ўсіх. Трэнер павінен ведаць усё пра сваіх падапечных і адчуваць наперад, што з імі будзе. У спорце, у быце, у хваробе — ён павінен ведаць свайго спартсмена, без гэтага не атрымаецца вывучыць яго характар і вырасціць чэмпіёна.

**— Перад Алімпійскімі гульнямі ў Атланце 1996 года вы сталі гуляючым трэнерам, для барацьбы гэта распаўсюджаная практыка?**

— Не сказаў бы, што трэнер часта пачынае сам бароцца, у мяне так здарылася. На той момант у нас была добрая каманда, але паступова пачалі здаваць пазіцыі, патрэбен быў лідар. І каля я вярнуўся на дыван, спартсмены за мной пацягнуліся, узбадзёрыліся. Я самастойна заваяваў ліцэнзію на Алімпійскія гульні ў катэгорыі 68 кілаграмаў. Перада мной не стаяла задача задавольваць свае амбіцыі, мне было важна ўзбадзёрыць каманду. Гэта было нялёгка, прыйшлося сагнаць амаль 10 кілаграмаў вагі, нагадалі аб сабе былыя траўмы... Даводзілася і самому трэніравацца, і за камандай сачыць, побач, канешне, былі іншыя трэнеры, але ўся адказнасць ляжала на мне. Памятаю, у Алушце на зборы бягу крос і думаю: «А навошта мне гэта трэба?» І адразу ўнутраны голас адказвае: «Калі ўзяўся, трэба давесці да канца». У мяне ўсе жыццё так — калі нешта пачаў, трэба закончыць, як бы цяжка ні было.

***— А як вам пасада кіраўніка федэрацыі?***

— Я прайшоў усе спартыўныя ступені: спартсмен, трэнер, цяпер старшыня федэрацыі. І з кожным этапам становіцца ўсё складаней. Добра быць спартсменам, адказваеш толькі за сябе. Трэнер адказвае за падрыхтоўку і стан спартсменаў. А старшыня федэрацыі — увогуле за ўсіх і ўся, гэта адказнасць за барацьбу ва ўсёй краіне.

***— Камандар Бафаліевіч, пасля вас у гісторыі беларускай барацьбы не было алімпійскіх чэмпіёнаў. Як вы лічыце, чаму так атрымалася?***

— Шмат фактараў, якія можна аналізаваць бясконца. Я сам мару, каб у нас з'явіўся новы алімпійскі чэмпіён. Бліжэй усяго да перамогі мы былі ў 1996 годзе, тады ў нашай каманды мелася два сярэбраныя і адзін бронзавы медалі. Каманда выступіла дастойна, але крыху не хапіла.

***— Чым адрозніваюцца барцы вашага пакалення ад сённяшніх?***

— У мой час у зборную траплялі самыя лепшыя, самыя таленавітыя барцы з 15 рэспублік, канкурэнцыя была вялізная. У кожнай школы мелася свая адметнасць і члены зборнай. Трэніруючыся круглы год разам, мы пастаянна вучыліся адзін у аднаго. У мяне не павернецца язык сказаць, што сённяшнія барцы горшыя, чым былі мы, гэта не так. Проста змены ў свеце змянілі людзей. Да іх трэба знайсці падыход, зразумець іх унутраны стан, жыць іх жыццём.

***— У чым была адметнасць беларускай школы?***

— Беларуская школа была адной з самых моцных, гэта факт. Яна славілася партэрнай барацьбой, у якой выкарыстоўваліся асаблівыя прыёмы.

***— Камандар Бафаліевіч, назавіце, калі ласка, пяць найлепшых барцоў усіх часоў і народаў, на ваш погляд.***

— Каварнае пытанне. На жаль, з сучасных барцоў амаль нікога не магу назваць. У мой час барцоў ведалі не па імёнах, а па каронным прыёме, у кожнага ён быў свой. Цяпер такога няма, таму цяжка супаставіць. Канешне, у спіс найлепшых барцоў неабходна ўключыць легендарнага Аляксандра Карэліна. Мы былі з ім у адной камандзе, ён толькі прыйшоў у зборную, а я ўжо выступаў. З тых часоў мы сябруем. Аляксандр — флагман грэка-рымскай барацьбы. Не магу не адзначыць Мікалая Балбошына, праўда, у яго была адна праблема — часта турбавалі траўмы. Без гэтага ён мог бы дасягнуць яшчэ больш поспехаў. Алега Караваева вылучу, я яго не застаў, але па расказах ведаю, што гэта быў унікальны спартсмен. Калі ўсё ж такі паспрабаваць вылучыць кагосьці з сучасных, то адзначу егіпцяніна Карама Габера. І ўключу ў гэты спіс найлепшых нашага Ігара Каныгіна — трохкратнага чэмпіёна свету, чатырохкратнага чэмпіёна Еўропы. На жаль, у яго не атрымалася стаць алімпійскім чэмпіёнам.

**«Так заўсёды было: на дыване — сапернікі, за яго межамі — сябры. Гэта лагічна, выступленні рана ці позна заканчваюцца, а жыццё працягваецца. А як жыць без сяброў?»**

***— Чым вы ганарыцеся больш за ўсё?***

— Па ідэі, я павінен ганарыцца, што выйграў Алімпійскія гульні. Але я сфармулюю гэта інакш, там я атрымаў задавальненне, якое хацеў атрымаць. Я дасягнуў таго, да чаго імкнуўся шмат гадоў. І самае галоўнае — я даказаў самому сабе, што магу. Многія няправільна думаюць, што боруцца для кагосьці іншага. Але чалавек, у першую чаргу, усё робіць для сябе, а людзі потым гэта ацэньваюць.

***— А калі вы былі больш за ўсё шчаслівы?***

— Канешне, на алімпійскім п'едэстале. Калі б можна было штосьці ў сваім жыцці змяніць, пэўныя моманты я падкарэктаваў бы, але ўсё роўна выбраў бы барацьбу. Шчасце на алімпійскім п'едэстале — гэта адно шчасце, а ёсць жа яшчэ і сям'я, якая таксама шмат шчаслівых момантаў падарыла.

***— Як ваша жонка ставілася да таго, што вы былі пастаянна ў раз'ездах?***

— Іна стойка ўсё вытрымала, яна вельмі цярплівая і мудрая жанчына. Калі тылы прыкрыты, то ўсё будзе атрымлівацца, мне ў гэтым пашанцавала.

***— Вы — бацька дачкі, але, напэўна, мужчыну заўсёды хочацца яшчэ і сына. Можна сказаць, што ў вас цэлая федэрацыя «сыноў»?***

— У мяне не проста федэрацыя, у мяне паўкраіны «сыноў» — кожны хлопчык, які займаецца барацьбой, у пэўнай ступені мой сын.

***— Камандар Бафаліевіч, які ваш галоўны жыццёвы прынцып?***

— Я заўжды кажу, што трэба ісці па жыцці правільна, не рабіць гадасцяў. А жыццё ўжо само накіруе на патрэбны шлях.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота НАК Беларусі і з асабістага архіва героя.**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| Продавец | **ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| Наименование (составные части и принадлежности) | Общая площадь | Инвентар. номер |
|---|---|---|
| **Лот № 1**<br>**Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, д. 13** | | |
| **Производственный корпус ГСПКТБ № 1** | 2980,4 кв. м | 710/С-13026 |
| **Здание склада нефтепродуктов** (составные части и принадлежности: пристройка) | 86 кв. м | 710/С-13003 |
| **Здание автомобильных весов** | 29 кв. м | 710/С-13004 |
| **Площадки и проезды** (составные части и принадлежности: площадки бетонные (л. а1, а2, а3, а4, а5), дорожка (л. а8), асфальтобет. площадка (л. а6) и проезд(л. а7) | 6580 кв. м | 710/С-74589 |
**5.00** Пітэр Пэн (12+).
**6.45** Капітан Крук (12+).
**9.10** Трыстан і Ізольда (12+).
**11.15** Прыгажуня і пачвара (12+).
**13.15** Дзяўчына з Джэрсі (16+).



**15.10** Вясельны перапалох (12+).
**17.00** Сэрцаед (16+).
**19.00** РЭД (16+).
**21.00** Шпіён, які мяне кінуў (16+).
**23.00** З Парыжа з любоўю (16+).
**0.35** Іспанская-англійская (16+).
**2.50** Рэальнае каханне (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30** Хатабыч (16+).
**7.10** Выкрутасы (12+).
**8.55** Сняданак у таты (12+).
**10.30** Горка! (16+)
**12.20** Горка!-2 (16+).
**14.05, 19.10** Чорныя кошкі (16+).
**16.00** Жанік (12+).
**17.40** Нерэальнае каханне (12+).
**21.00** На кручку! (16+)
**22.35** Мужчына з гарантыяй (16+).
**0.10** Канікулы строгага рэжыму (12+).
**2.05** Кур'ер з «Раю» (12+).
**3.40** Час пік (16+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.20, 13.10, 17.30, 5.10** Аўта-SOS (16+).
**7.10, 10.35** Інстынкт выжывання (16+).
**8.00, 21.00, 2.45** Ледзяная дарога (16+).
**8.50** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.25** Зона будаўніцтва (16+).
**12.15, 16.40, 4.20** Асушыць акіян (16+).
**14.00, 18.20, 0.20** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**14.55, 19.15** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**15.50, 20.10** Фабрыка ежы (16+).
**21.50** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу (16+).
**22.40** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**23.30** Ліхтугі за мяжой: злачынства і пакаранне (16+).
**1.55** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**3.35** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).

## Discovery

**8.00** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**8.45, 18.03** Багажныя войны (12+).
**9.10, 10.25, 23.09** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**9.35, 22.18** Круты цюнінг (12+).
**11.15, 15.30, 21.27, 4.56** Як гэта ўладкавана? (12+)
**12.06, 13.48, 17.12, 19.45, 7.14** Махінатары (12+).
**12.57** Рэстаўратары лодак (12+).
**14.39, 6.28** Жаночая аўтамайстэрня (12+).
**16.21, 1.42** Музейныя загадкі (12+).
**18.54** Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
**20.36, 5.42** Паляўнічыя на склады (16+).
**0.00** Узрываючы гісторыю (12+).
**0.51** Выжыць разам (12+).
**2.33** Палёты ўглыб Аляскі (12+).
**3.24** Выбуховае шоу (16+).
**4.10** Геній аўтадызайну (12+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10** «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
**9.10, 22.20 Серыял «След» (16+).**
**10.45, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Халодныя берагі». 1—2-я серыі (16+).**
**13.05, 14.45, 15.25 Меладрама «Прыгонная» (16+).**
**14.00** «Здарова здаровым быць!» (6+) [СЦ]
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часінка.
**18.15, 0.35** «Зона Х». Крымінальныя навіны (16+).
**21.00** Панарама.
**21.50** Адзін дзень (12+).
**0.15** Сфера інтарэсаў.
**1.00** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+).
**9.00, 18.20** Тэлебарометр.
**9.05, 20.15 Серыял «Сляпая» (16+).**
**10.05, 23.00** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.00, 18.25 Серыял «Браты па крыві» (16+).**
**12.50, 0.10 Серыял «Анатомія страсці» (16+).**
**13.40** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**14.40** «Муж напракат» (16+).
**15.40** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.45** «Пін_код» (12+).
**16.30 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**17.20** «Супержонка» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.20** «Мяняю жонку» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабранранак».
**07.35, 12.25** «Беларуская кухня». Вэргенікі.
**8.05, 12.00, 20.20** Навіны культуры.
**8.25** «Гэты дзень».
**8.30, 18.05 «Дзікае паляванне караля Стаха». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.40, 23.15** «Люблю і памятаю». Уладзімір Караткевіч.
**11.20, 17.40** «Запіскі на палях». Уладзімір Караткевіч: трафей «Дзікага палявання» [СЦ].
**11.50** «Архітэктура Беларусі».
**12.55, 21.05** «Апошні дзень». Лео Дураў (12+).
**13.30, 21.40 «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Маст. фільм (12+).**
**14.55** «Сівая легенда Уладзіміра Караткевіча». Дак. фільм.
**15.25 «Чорны замак Альшанскі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 4-ы тур. «Барусія» (Менхенгладбах) — «Шахцёр» (Украіна).
**9.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 4-ы тур. Дзённік гульнявога дня.
**9.50** Слэм-данк.
**10.20** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Мяшкоў-Брэст» (Беларусь) — «Фленсбург» (Германія).
**11.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 4-ы тур. «Інтэр» (Італія) — «Рэал» (Мадрыд, Іспанія).
**13.55** Спорт-мікс.
**14.05** Між іншым.
**14.25** Агнявы рубеж.
**15.00** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Лакаматыў» (Орша) — «Нёман» (Гродна).
**17.00** Вось гэта спорт!
**17.15** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы. Кіеў.
**18.15** Фактар сілы.
**18.45** Авертайм. КХЛ.
**19.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Віцязь» (Маскоўская вобл.) У перапынках — Авертайм. КХЛ.
**21.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 4-ы тур. ЦСКА (Расія) — «Феенаорд» (Нідэрланды). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**22.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 4-ы тур. «Рэйнджэрс» (Шатландыя) — «Бенфіка» (Партугалія). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)

## АНТ

**6.00, 7.20, 8.20** «Наша раніца».
**7.00** [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 1.30** Нашы навіны.
**9.15** «Аб'ектыўНА» (16+).
**10.15** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.15** «Грамадзянская абарона» (16+).
**13.15, 22.45 Серыял «Жаніць нельга памілаваць» (16+).**
**15.05** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.40** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
**21.40 Серыял «Доктар Праабражэнскі» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45, 8.40** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00, 23.55** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.20** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.40, 21.45, 0.45** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.05** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 20.50** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**15.35, 16.50** «Уладзімірская, 15». Серыял (16+).
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Меншчына».
**20.30** «Зроблена».

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Музычная гісторыя» (12+).**
**6.20, 10.10, 19.25 Серыял «Штрафнік» [СЦ] (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 17.15** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** Сусветнае пагадненне (16+).
**21.40** Тэлегульня «Гульня ў кіно». Радыё «Рэтра FM».
**23.25** Шоу «Назад у будучыню» (12+).
**23.20** «Сусветныя гульні розуму» (12+).
**0.15 Серыял «Адліга» (12+).**
**4.15 Маст. фільм «Таямнічы востраў» (12+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.35 Серыял «Жыццё пасля жыцця» (12+).**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.40 Серыял «Марозава» (12+).**
**17.15** «60 хвілін».
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.00 Серыял «Грозны» (16+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** Беларусы (6+).
**6.40, 16.25, 19.40, 22.20, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**6.50** «Здароўе» (12+).
**7.35, 8.25** «Справа ўрачоў» (16+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.45 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**9.40, 22.25** «НЗ.by».
**10.25, 21.15 Драма «Чужы сярод сваіх» (16+).**
**11.20, 13.50 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**13.25, 16.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.50** Пракурорская праверка (16+).
**16.55, 0.00** «ДНК» (16+).
**18.05, 19.55 Серыял «Пёс» (16+).**
**22.45 Серыял «Груз» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.50, 21.10, 0.20** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.00** «Мультпарад» (6+).
**7.30, 15.55, 20.50** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**7.35 Серыял «Звышнатуральнае» (12+).**
**8.15, 19.20 Серыял «Мар'ін гай» (16+).**
**9.00** М/ф «Скубі Ду» (12+).
**10.30** «Рыхтуй як шэф» (12+).
**11.00, 16.40 Серыял «Непрыдуманая гісторыя» (16+).**
**12.35 Баявік «Армагедон» (12+).**
**15.00, 18.25 Серыял «Скрозь снег» (16+).**
**18.10** «Фэшн is my прафэшн» (12+).
**19.15** «Надвор'е».
**20.55** «Вечарніца» (6+).
**21.15 Дэтэктыў «Другі фронт» (16+).**



## ВТБ

**6.05, 3.15** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.45, 4.35** «Лаві момант» (16+).
**9.10, 14.00** «Наш рамонт» (16+).
**9.50, 14.45** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.15** «Супермамачка» (16+).
**11.20** Серыял «СеняФедзя» (16+).
**12.55** «Руса турыста» (16+).
**16.15** Серыял «Нефармат».
**19.25** Серыял «Пагналі» (16+).
**20.30** Серыял «Радкам» (16+).
**21.30** Камедыя «Вельмі дрэнная настаўніца» (16+).



**23.20** Серыял «Каманда Б» (16+).
**0.20** «Уральскія пельмені» (16+).
**1.20** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**2.35** «Адна за ўсіх» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква дваранская.
**7.05** «Правілы жыцця».
**7.35, 18.05, 1.00** «Фактар Рэнесансу». Дак. фільм [СЦ].
**8.40, 20.45** Да 95-годдзя з дня нараджэння Ноны Мардзюковай. «Маладая гвардыя». Маст. фільм [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** ХХ стагоддзе. Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна» з Міхаілам Ульянавым. 1981 год.
**12.15, 22.15** «Віктор Гюго. Вораг дзяржавы». Серыял.
**13.05** Правінцыйныя музеі Расіі. Алушта [СЦ].
**13.35** Лінія жыцця. Фабія Мастранджэла.
**14.30, 23.10** «Восем смяротных грахоў». Дак. серыял [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.20** Мая любоў — Расія!
«Залаты век рускай кафлі» [СЦ].
**15.50** «2 Вернік 2».
**16.45** Жыццё выдатных ідэй. «Тэлепартацыя: правілы гульні ў косці і квантавання трусоў».
**17.10, 1.55** Да юбілею аркестра. Алібэк Днішаў і Акадэмічны аркестр рускіх народных інструментаў ЦТ і ВР. Дырыжор Мікалай Някрасаў. Запіс 1990 года.
**19.00** Да 90-годдзя Ігара Залатускага. «Кнігі майго лёсу». 4-я серыя, заключная [СЦ].
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** Адкрытая кніга. Уладзімір Крупін. «Вяртанне крыніцы» [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**22.05** Колер часу. Ван Дэйк.
**0.00** ХХ стагоддзе. Сустрэча ў Канцэртнай студыі «Астанкіна» з Міхаілам Ульянавым. 1981 год.
**2.40** Пры́гожая планета.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (16+).
**06.50** Маст. фільм «Сярод шэрых камянёў» (16+).
**8.15** Фільм-канцэрт «У нашым доме» (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.45, 11.00, 14.40, 15.45, 17.00, 21.45, 23.00, 0.55, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.00** Маст. фільм «Дамы ўдаўца» (16+).
**17.40** Тэлеспектакль «Тры сястры» (12+).
**23.20** Дак. фільм «Фільм пра фільм. Беражыся аўтамабіля» (16+).
**0.00** The Best of «СевАлогія» (18+).
**1.10** Маст. фільм «Вяселльны падарунак» (16+).
**2.30** «Ранішняя пошта».
«Розныя думкі». 1986 год (12+).

## EuroSport 1

**2.05** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету (12+).
**3.30** Біятлон. Кубак свету (6+).
**5.00, 10.30, 15.30** Снукер. UK Championship (6+).
**7.00, 13.30** Лыжныя гонкі. «Тур дэ Скі» (6+).
**9.00, 12.30** Лыжнае дваяборʼе. Кубак свету (12+).

## Кінакамедыя

**1.05** Каханне без перасадак (16+).
**2.55** Круты і дыбачкі (12+).
**4.40** Каханне і іншыя лекі (16+).
**6.45** Каляды з няўдачнікамі (16+).
**8.35** Вампірскі засос (16+).
**10.10** Паедзем да чортавай бабулі (12+).
**12.00** Гэты няёмкі момант (16+).
**13.50** Заўсёды кажы «так» (12+).



**15.50** Суперстар (16+).
**17.30** Вядзьмарка (18+).
**19.30** З вачэй — далоў, з чорта — прэч! (16+)
**21.25** Рыбка па імені Ванда (16+).
**23.25** Гэта ўсё яна (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.30, 23.35** «Улегцы» (12+).
**9.05, 15.25, 4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**10.10, 17.10** «Старац» (16+).
**10.50, 18.20** «Сляпая» (16+).
**12.00, 19.30** «Варажбітка» (12+).
**13.10** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.15** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.30, 4.00** «Знакі лёсу» (16+).
**20.45** «Косці». Серыял (16+).
**22.35** «Грым». Серыял (16+).
**0.15** «Знак якасці» (16+).
**1.05** «Ідэнтыфікацыя Борна». Маст. фільм (12+).



## ТБ1000

**5.00, 15.30** Бібліятэкар: у пошуках дзіды лёсу (16+).
**6.30** Сем гадоў у Тыбеце (16+).
**8.50** Маска Зора (12+).
**11.10** 1 + 1 (16+).
**13.15** Сем жыццяў (16+).



**17.10, 0.55** Солт (16+).
**19.00, 2.50** Лара Крофт: калыска жыцця (12+).
**21.00** Містар і місіс Сміт (16+).
**23.10** Дзевяць ярдаў (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**5.30, 15.10** Граніца. Таежны раман (16+).
**7.55, 0.00** Хатабыч (16+).
**9.50** Ярды (16+).
**11.40** Выкрутасы (12+).
**13.25** Чорныя кошкі (16+).
**17.35** Памятаю — не памятаю! (12+).
**19.00** Гетэры маёра Сакалова (16+).
**20.55** Вяселле па абмене (16+).
**22.35** Шчасця! Здароўя! (16+)
**2.00** Сняданак у таты (12+).
**3.45** Кур'ер з «Раю» (12+).

## National Geographic

**6.00** Навуковыя глупствы (16+).
**6.25, 13.20, 17.35, 5.15** Аўта-SOS (16+).
**7.15, 10.50** Інстынкт выжывання (16+).
**8.05** Ледзяная дарога (16+).
**9.00, 12.30, 16.45** Дзікі тунец: Поўнач супраць Поўдня (16+).
**11.40** Зона будаўніцтва (16+).
**14.10, 18.25, 21.00, 0.20, 2.45** Расследаванне авіякатастроф (16+).
**15.05, 19.15** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**15.55, 20.10** Фабрыка ежы (16+).
**21.50** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія (16+).
**22.40** Гарачыя межы: Лацінская Амерыка (16+).
**23.30** Ліхтугі за мяжой: злачынствы і пакаранне (16+).
**1.55** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**3.35** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**4.20** Асушыць акіян (16+).

## Discovery

**8.00, 3.24** Выбуховае шоу (16+).
**8.45, 10.25, 23.09** Паляўнічыя на рэліквіі (16+).
**9.35, 22.18** Круты цюнінг (12+).
**11.15, 15.30, 21.27, 4.56** Як гэта ўладкавана? (12+)
**12.06, 17.12, 19.45** Махінатары (12+).
**12.57** Гіганцкія будоўлі (12+).
**13.48** Дабітыя тачкі (12+).
**16.21, 1.42** Музейныя загадкі (12+).
**18.03, 23.35** Багажныя войны (12+).
**18.54** Рэальныя дальнабойшчыкі (12+).
**20.36, 5.42** Паляўнічыя на склады (16+).
**0.00** Залатая ліхаманка (16+).
**0.51, 6.28** Выжыць разам (12+).
**2.33** Палёты ўглыб Аляскі (12+).
**4.10** Геній аўтадызайну (12+).
**7.14** Голыя і напалоханыя (16+).

# У ЗОНЕ АСАБІСТАЙ АДКАЗНАСЦІ

## Магілёўскі старшыня вулічнага камітэта пра нюансы грамадскай работы

**Віталь Гардзееў сябруе з «МС» ужо даўно. Некалькі разоў на старонках выдання падымаліся ініцыяваныя ім вострыя тэмы, якія доўгі час не вырашаліся на мясцовым узроўні. І змены адбываліся. Нядаўна Віталь Гардзееў патэлефанаваў у карпункт і зноў запрасіў у госці. Заінтрыгаваў, што ёсць дзве навіны — добрая і дрэнная.**



На месцы былога сметніка з'явіліся шматпавярховікі.

### Добрая навіна

Два гады таму прынцыпова вулічкам прасігналізаваў, што на «нічыёй» тэрыторыі арганізавана несанкцыянаваная звалка. І гэта побач з цэнтральнай вуліцай горада. Карэспандэнт выехала на месца, і факт пацвердзіўся. Звалка пасля публікацыі ў газеце была прыбраная, а вось сёлета на гэтым месцы паявілася некалькі жылых шматпавярховікаў.

— Вось бачыце, які добры вынік атрымаўся, — радуецца Віталь Фёдаравіч. — І вы вельмі нам дапамаглі. Зараз я збіраю подпісы людзей, якія разам са мной выказваюць удзячнасць усім, хто застаўся неабыякавы да нашых зваротаў. Вам у рэдакцыю таксама дашлю.



Хутка ўчастак ператворыцца ў сметнік.

Пакуль мы глядзелі, як шчыруюць на апрацоўцы фасадаў будынкі, Віталь Фёдаравіч паспеў падзякаваць усім тым, хто калісьці стварыў нешта добрае для яго мікразоны № 5, якую ў народзе называюць Чапаеўка. Прыватны сектар знаходзіцца паміж дзвюма галоўнымі аўтамагістралямі горада — вуліцамі Крупскай і Першамайскай. Тут усё ўперамешку — катэджы і сціплыя дамкі, гаспадары і неахайныя жыхары, цывілізацыя і амаль поўная яе адсутнасць. Праблем хапае, і рашаюцца яны з пераменным поспехам. Асабліва вулічкам хваліў былога старшыню Магілёўскага гарсавета Андрэя Кіблова, які шмат увагі аддаваў стану дарог. Цяпер былы старшыня ўзначальвае абласное камунальнае ведамства, і Гардзееў яго болей не турбуе. Гэта ж зусім іншы ўзровень. Добрым словам згадаў мой спадарожнік і дырэктара камунальнага прадпрыемства «Гарсвятло» Аляксандра Пашкевіча, зрабіўшы акцэнт на тым, што ліхтары на вуліцах Краснадарскай і Валгаградскай таксама мяняліся пры садзейнічанні нашага выдання.

— Вельмі прыемна, калі на нашы звароты рэагуюць, нешта робяць, каб выправіць становішча, — кажа суразмоўнік. — Але, на жаль, гэта робяць не ўсе. Таму так важна адзначыць лепшых. Хай іншыя на іх раўняюцца.

### Навіна дрэнная

Па меры таго, як мы паглыбляліся ў прыватны сектар, тон прадстаўніка мясцовага самакіравання станавіўся ўсё больш крытычны і суровы.

— Ну і куды гэта варта? — абураўся ён, паказваючы на яму з вадой у самым пачатку вуліцы Валгаградскай. — Няўжо цяжка яе засыпаць. Або вось гэтая каляіна. Яна ўтварылася, калі пракладвалі кабель. Тут бардзюр быў, цяпер няма. Колькі разоў прасіў зрабіць, як было, не пачулі. Усё завалілі абы-як і кінулі. А ў адказе напісалі, што ўсё добра. Цяпер машыны крыху ўтрамбавалі, а было зусім не па-гаспадарску.

Вулічкам паспявае і падзякаваць за тое, што вуліцу падсыпалі, і пасварыцца, што ніхто пасля гэтага не хоча глядзець за яе станам. Перажывае, што не можа дабіцца толку.

Тры гады таму цэнтральную вуліцу мікразоны Валгаградскую засыпалі асфальтагранулятам. Зараз зноў дзірка на дзірцы. Хутка ў такім стане будзе і Адэская, якую падлаталі летась.

— Як можна па такіх ямках пускаць грэйдар? — не разумее актывіст. — Дастаткова адзін раз пакласці асфальт і забыцца пра вуліцу на доўгі час. Кожны год латаць на дарозе дзіркі атрымліваецца даражэй. На Падніколлі, дзе таксама прыватны сектар, асфальт паклалі, чым мы горшыя?

Праходзім міма вуліцы Краснадарскай. Відаць, што там рабілі ямачны рамонт. У Гардзеева ёсць прэтэнзіі да якасці, але «мірыцца можна», лічыць ён, і мы ідзём далей. Дарэчы, вузкая тратуарная сцежка, па якой крочым, таксама вынік клопату няўрымслівага старшыні вулічнага камітэта і яго рэгулярных зваротаў у камунальныя службы.

### Камень спатыкання

Дакладней яма з вялікай лужынай у Нафтавым завулку. Калісьці ў планах гарадскіх камунальных службаў быў намер зрабіць вадасцёк, але грошай не знайшлося. Можна было б засыпаць асфальтагранулятам, але куды вадзе дзявацца. Яна будзе пераліваца ў чыйсьці агарод. «Такое рашэнне нам не патрэбна», — кажа Віталь Гардзееў. Але і мірыцца з такім становішчам не вельмі хочацца. Атрымліваецца, што без вадасцёку ніяк.

Акрамя дарожных дзірак на мікразоне ёсць і іншыя праблемы. Напрыклад, неахайная нерухомасць, якую спадчыннікі не жадаюць даглядаць, аўтахлам, што стаіць гадамі каля некаторых двароў, непрыбраныя прыдамавыя тэрыторыі. У Нафтавым завулку вулічкам налічыў ажно чатыры аўто, якія стаяць самотныя па некалькі гадоў запар.

Ніякай крытыкі не вытрымлівае і дом № 8 у гэтым жа завулку. Агароджа нахілілася, брамка амаль на зямлі ляжыць. Вунь ужо і прыступкі ў дом пачалі разбурацца, а вакол сухое пустазелле.

— Гаспадары тут не жывуць, а суседзі пачынаюць зносіць смецце, — абураецца Віталь Фёдаравіч. — Па адным доме на Валгаградскай наогул быў скандал. Там такі сметнік утварылі, страшна ўспомніць. Я званіў ва ўсе званы, прыцягваў увагу, як мог. Сметнік прыбралі, але ж напаўразбураны дом застаўся. І ўсе разумеюць, што парадак там часовы. А такіх дамоў па нашай мікразоне, напэўна, шэсць або сем.

Прынцыповасць вулічкама на мікразоне не ўсім падабаецца. Па законе кожны павінен даглядаць яшчэ і частку тэрыторыі за сваёй агароджай. Але некаторыя гэта правіла ігнаруюць. І напорыстасць галоўнага па вуліцы іх толькі злуе. На свавольных Гардзееў выклікае праваахоўнікаў. І тады справа вырашаецца хутчэй. Хоць, часам, непрыемны прысмак застаецца.

— Па сутнасці, кантрольныя органы павінны мяне падтрымліваць, але часам узнікаюць непаразуменні, — уздыхае суразмоўнік. — Аднойчы на мяне нават «наехалі»: што табе больш за іншых трэба? Пакуль свае «корачкі» старшыні мікразоны не паказаў, нават не хацелі рэагаваць. Было вельмі крыўдна. Калі ёсць закон, яго павінны выконваць усе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара.**

### Каментарый у тэму

**Таццяна ГРЫШАНАВА, член каардынацыйнага савета па грамадскім тэрытарыяльным самакіраванні адміністрацыі Ленінскага раёна:**

— На тэрыторыі раёна створана 45 вулічных камітэтаў. Самыя актыўныя вулічкамы — у мікрараёнах Чапаеўка, Падгорная, Ямніца, на вуліцы Садовая, на Юбілейным... Менавіта неабыякавыя людзі прысвячаюць грамадскаму жыццю шмат асабістага часу. Як правіла, гэта тыя, хто знаходзіцца на пенсіі. Канструктыўныя прапановы заўсёды вітаюцца, мы іх чакаем і бяром пад увагу. Усё, што ў нашых сілах, робім. Такія людзі патрэбны, бо яны паведамляюць пра тыя праблемы, якія існуюць у мікразонах.

Можна было б нават дадаць больш паўнамоцтваў старшыням вулічных камітэтаў. Пакуль яны маюць права вырашаць грамадскія праблемы ў рамках закона аб зваротах грамадзян, але можна было б дазволіць ім з некаторымі пытаннямі разбірацца самастойна. Трэба было б спрасціць і рэгістрацыю органаў грамадскага самакіравання. Магчыма, было б больш ініцыятыўных грамадзян, якія вырашалі б праблемы ў маштабах сваёй тэрыторыі. Без капітальных укладанняў, вядома, не абысціся, але мы павінны разумець, што гэта і наша адказнасць. А тыя, хто выступае з прэтэнзіяй — «дайце мне, а мы вам нічым не абавязаныя», — павінны нарэшце зразумець, што даўно ўжо ніхто нікому нічога не павінен. Мы самі павінны падтрымліваць парадак там, дзе жывём. Гэта наша асабістая адказнасць.

# Новы ўзровень камфортнасці

## Участак дарогі да памежнага перахода «Пясчатка» ў абход горада Высокае адкрылі ў Камянецкім раёне, што на Брэстчыне

**Адкрыццё ўчастка дарогі Р16 Цюхінічы — Высокае — мяжа Рэспублікі Польшча (памежны пераход «Пясчатка») працягласцю звыш 13 кіламетраў адбылося каля адной з новых кальцавых развязак. Тут адразу адчуваюцца шырыня і зручнасць дарогі.**

Раней да міжнароднага пункта пропуску «Пясчатка» транспарт, у тым ліку і вялікагрузны, хадзіў праз населеныя пункты. Гэта стварала праблемы бяспекі, экалогіі і было нязручна для перавозчыкаў. Цяпер бетонная дарога даўжынёй амаль дзевяць з паловай кіламетраў праходзіць па новым напрамку ў абход горада Высокае, вёсак Абяроўшчына і Ваўковічы. На пад'ездзе да яе таксама рэканструявалі ўчастак аўтамабільнай дарогі працягласцю 3,8 кіламетра. Такім чынам, агульная даўжыня абноўленага ўчастка складае 13,3 кіламетра. Рэканструкцыя ажыццяўлялася па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва Польшчы, Беларусі, Украіны ў рамках буйнога інфраструктурнага праекта. Агульны кошт праекта склаў 5 160 000 еўра. З іх 516 000 еўра выдзеліў Рэспубліканскі дарожны фонд, астатнее прадстаўлена міжнароднай тэхнічнай дапамогай па праграме трансгранічнага супрацоўніцтва.



На новай дарозе паявіліся чатыры кальцавыя развязкі, іх узвялі на скрыжаваннях. Дарогу абсталявалі ліхтарамі і святлодыёднымі ўказальнікамі, што, несумненна, паспрыяе бяспецы руху. Разметка выкананая пры ўдзеле халоднага пластыку. Паводле слоў спецыялістаў, гэта зроблена для яе трываласці.

Участак дарогі, пра які ідзе гаворка, складаны. Яго адметнасць у тым, што па маршруце працякае рака Пульва, ёсць меліярацыйныя каналы, праходзіць чыгунка. Пытанні з воднай перашкодай вырашылі з дапамогай труб. У двух пунктах перасячэння з ракой пракладзена 19 воданапорных труб працягласцю 446 метраў. А над чыгункай узвялі новы пуцеправод.

— Гэта важныя і патрэбныя кіламетры не толькі ў жыцці рэгіёна, але і наогул у сетцы рэспубліканскіх аўтамабільных дарог, — адзначыла падчас адкрыцця **намеснік міністра транспарту і камунікацый краіны Наталля АЛЕКСАНДРОВІЧ.** — Гэта частка інфраструктуры, якая дазволіць знайсці новыя магчымасці лагістыкі і палепшыць якасць жыцця людзей.

**Намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім АЛЬШЭЎСКІ** падчас адкрыцця падзякаваў будаўнікам і праекціроўшчыкам генпадрадчыка, якім выступіў Дарожна-будаўнічы трэст № 4 Брэста, і іншых арганізацый, што прымалі ўдзел у рабоце. Вадзім Альшэўскі адзначыў, што ўпершыню на рэспубліканскіх дарогах Брэсцкай вобласці зроблена пакрыццё з цэментабетону, і гэта перспектыўны кірунак дарожнага будаўніцтва, якое, дарэчы, працягваецца.

Зараз вядзецца работа па адкрыцці лагістычных цэнтраў на тэрыторыі Камянецкага раёна, там будзе фарміравацца грузавы паток, які накіраваны на перасячэнне мяжы ў Пясчатцы. Праекты гатовыя, пачынаецца іх рэалізацыя.

— Новая дарога — заўсёды добра, а сучасная дарога дае новы ўзровень бяспекі, камфортнасці, большыя хуткасці, — зазначыў **генеральны дырэктар РУП «Брэстаўтадар» Міхаіл НЕПАЧАЛОВІЧ** і праінфармаваў, што будаўнікі прыступілі да рэканструкцыі трэцяга ўчастка дарогі Р16. Гэта пад'езд да чыгуначнай станцыі Высока-Літоўск.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.**

# ЗЫХОДЗЯЧЫ З МЕРКАВАННЯ БОЛЬШАСЦІ

## Толькі так вырашаюць пытанні ў Бараўлянскім сельсавеце, што пад Мінскам

**Апошнім часам тут шмат зроблена для стварэння камфортных умоў для пражывання грамадзян. У Бараўлянах уладкаваны аўтастаянкі для транспарту, дарожныя развязкі, тратуары, дваровыя тэрыторыі жылых дамоў, устаноўлены святлафоры. За пяцігодку пабудаваны дзве сярэднія школы — у Лескаўцы і Копішчы. Узведзена шэсць дзіцячых садкоў: у Копішчы, Лескаўцы і Бараўлянах. Гэта дазволіла разгрузіць чаргу з тых, хто мае патрэбу ў месцах у дзіцячых дашкольных установах. Шмат чаго з'явілася, а зрабіць трэба яшчэ больш. Абмеркаванне генеральнага плана, удзел грамадзян у вырашэнні найважнейшых пытанняў рэгіёна былі разгледжаны падчас сустрэчы кіраўніцтва Бараўлянскага сельвыканкама з мясцовымі актывістамі. Сустрэча прайшла пад дэвізам «Улада чуе людзей і прымае рашэнні, зыходзячы з меркавання большасці».**

### Ініцыятыва знізу

Якімі будуць населеныя пункты Бараўлянскага сельсавета ў перспектыве, у многім залежыць ад саміх жыхароў, іх творчага, крэатыўнага падыходу да справы.

— Нашы грамадзяне праяўляюць усё больш клопату, зацікаўленасці, каб у населеных пунктах быў належны парадак, выказваюць свае прапановы па добраўпарадкаванні вёсак, — расказвае **старшыня Бараўлянскага сельвыканкама Жанна ВАРАБЕЙ.** — Менавіта мы падтрымалі іх ініцыятыву па ўладкаванні зон адпачынку ў населеных пунктах. Напрыклад, такія месцы з удзелам грамадзян з'явіліся ў раёнах прыватнай забудовы ў Лескаўцы, Вопытным, Чарцяжы. Тут устаноўлены лаўкі, альтанкі, спартыўнае абсталяванне, створаны дзіцячыя пляцоўкі. Жыхары пасёлка Вопытны прапанавалі ўладкаваць зону адпачынку на лужку каля ляснога масіву, дзе раней планавалася пабудаваць дзіцячы садок і школу. Ініцыятыву знізу мы падтрымалі. Праект узгоднены з упраўленнем архітэктуры Мінскага райвыканкама. Тут будуць адпачываць розныя катэгорыі насельніцтва: дзеці, дарослыя, пенсіянеры. Таму вельмі важна, каб яны захоўвалі чысціню, не засмечвалі лес, дапамагалі спецлясгасу падтрымліваць парадак. Менавіта да гэтага мы іх заклікаем.

Практыкуецца на тэрыторыі сельсавета і прыватна-дзяржаўнае партнёрства. Дзякуючы гэтаму тандэму з'явіліся добрыя дарогі. Жыхары за свае сродкі зрабілі падсыпку вуліц у Дроздаве, Лескаўцы, Чарцяжы і часткова ў пасёлку Вопытны, а з раённага бюджэту былі выдаткаваны сродкі на асфальтаванне пакрыцця.

— Такія здаровыя ініцыятывы грамадзян мы падтрымліваем і прыцягваем іх да добраўпарадкавання населеных пунктаў. Добраўпарадкаванне, вядома, вядзецца круглы год службамі горада. Але добрай падмогай для наводзення парадку на зямлі становяцца месячнікі, сумесныя суботнікі. У Вопытным, Каралёвым Стане, Курганах разам з людзьмі выходзяць наводзіць глянец у месцах агульнага карыстання жыхары. Глядзяць яны таксама, каб у падворках, на прылеглых тэрыторыях было чыста.



Такія дарогі ўладкаваны ў населеных пунктах сельсавета.

### Садок і школа ў новым месцы

— Жанна Аляксандраўна, доўгі час працягвалася грамадскае абмеркаванне генеральнага плана забудовы Бараўлян. У прыватнасці, бацькі былі нязгодныя з тым, што школа і дзіцячы садок будуць змешчаны ў лесе ў раёне вуліцы Жамчужнай, дзе дрэвы часткова падлягалі высечцы. Чым закончылася справа?



Зоны адпачынку – ініцыятыва мясцовых жыхароў.

— Сапраўды, абмеркаванне ішло тры гады, было праведзена шмат сустрэч жыхароў з прадстаўнікамі ўлады розных узроўняў. У 2018 годзе генплан зацвердзілі, але жыхары былі супраць узвядзення ўстаноў адукацыі ў лясным масіве. Ды сітуацыя вырашылася станоўча. Старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр Турчын, старшыня Мінскага райвыканкама Уладзімір Юргевіч з разуменнем паставіліся да меркавання людзей і звярнуліся да кіраўніка дзяржавы. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падтрымаў прапанову грамадзян аб пераносе будаўніцтва дзіцячага садка і школы ў іншае месца.

А яшчэ раней, у 2019 годзе, Прэзідэнт узгадніў адвод дзевяці гектараў даследнай зямлі, якая належала Беларускаму аграрнаму ўніверсітэту. На гэтым участку акрамя дзіцячага садка на 240 месцаў за сродкі сталічнага бюджэту прадугледжана ўзвядзенне шматкватэрных дамоў для шматдзетных сем'яў усяго Мінскага раёна — для іх стварана адзіная чарга. Будоўля павінна пачацца ў 2021 годзе.

### Новая кацельня сэканоміць валюту

У сувязі з будаўніцтвам жылля, сацыяльных аб'ектаў у абнаўленні і рэканструкцыі маюць патрэбу інжынерныя сеткі.

— Мы даведаліся пра будаўніцтва новай кацельні, калі каля нашых дамоў пачалі пракладваць камунікацыі і высякаць дрэвы, — кажуць жыхары вуліцы 40 гадоў Перамогі. — Нас супакоілі, што замест іх будуць праведзены кампенсацыйныя пасадкі пасля пракладкі камунікацый і завяршэння земляных работ. Месцы азелянення ўзгодняць з мясцовымі ўладамі. Мы, канешне, не супраць будаўніцтва гэтага аб'екта, які жыццёва неабходны Бараўлянам. Паколькі з кожным годам з'яўляюцца новыя сацыяльныя аб'екты, жыллё, населены пункт прырастае жыхарамі.

— Праект рэалізуецца з удзелам сродкаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. Цяпер у Бараўлянах працуюць дзве цеплакрыніцы на газе. А газ — дарагое задавальненне, закупляецца за валюту, — кажуць будаўнікі, якія шчыруюць на пляцоўцы. — Гэтая кацельня будзе працаваць на мясцовых відах паліва. Будуць задзейнічаны тры катлы новага ўзору па сем мегават кожны. Работы на аб'екце падыходзяць да лагічнага заканчэння. У найбліжэйшай перспектыве яго ўвядуць у дзеянне.

### Канкурэнцыя падштурхоўвае да спаборніцтва

На выездзе з Бараўлян на трасе М3 Мінск — Віцебск таксама кіпіць работа. Тут з'явіцца вялікі функцыянальны цэнтр NOVAMALL. Гэта будзе звышсучасны гандлёвы аб'ект, дзе прадугледжаны супермаркет, аб'екты сферы паслуг, грамадскага харчавання, адпачынку, прадугледжана таксама аўтастаянка на 220 месцаў. Плошча цэнтра амаль што 6000 квадратных метраў.

Аб'ект удала размешчаны з пункту гледжання лагістыкі — прамы заезд з аўтатрасы. Ды і кліентаў, мяркую, будзе дастаткова — на тэрыторыі сельсавета пражывае 65 тысяч чалавек. А ў навакольных населеных пунктах няма буйных сучасных аб'ектаў такога плана.

— Я жыву на вуліцы Малінаўскай. І вельмі чакаю яго адкрыцця, паколькі будучы цэнтр знаходзіцца побач з маім домам і мне будзе зручна яго наведваць. Буду хадзіць сюды з унукамі, кажуць, шмат цікавых забаў будзе тут арганізавана і для малых, — радуецца Ганна Іванаўна.

— А я вось аддаю перавагу невялікім крамам, — уступае ў размову яе сяброўка. Часта наведваюся на мясцовы рынак, дзе заўсёды свежыя прадукты.

Сапраўды, у цэнтры населенага пункта на агароджанай заасфальтаванай пляцоўцы стаяць некалькі невялікіх крамаў — рыбная, мясная, дзе асартымент тавараў здзівіць нават гарадскога жыхара — сасіскі, каўбасы вэнджаныя, вараныя, вяндліна, свініна, ялавічына. Пра тое, што гэтыя гандлёвыя пункты карыстаюцца попытам сярод мясцовых жыхароў, сведчыць чарга.

Колькасць гандлёвых аб'ектаў на тэрыторыі сельсавета перавышае сацыяльныя стандарты. Але тое, што з'яўляюцца новыя, гэта добра. Канкурэнцыя падштурхоўвае да лепшага абслугоўвання пакупнікоў, новых форм работы. І спажыўцам ёсць магчымасць з лепшага выбіраць найлепшае.

Пасля наведвання рынку кіруюся ў цэнтр. Тут уладкаваная пляцоўка для адпачынку, арганізацыі канцэртаў з крытай сцэнай. Абапал яе ўпрыгожваюць газоны, маладыя туі. На лаўцы гутараць дзве пажылыя жанчыны.

— Чаго не хапае вам у Бараўлянах? — звяртаюся да іх.

— Нам, пенсіянерам, хацелася б далейшага развіцця медыцынскай дапамогі — часта здароўе падводзіць, — гучыць у адказ.

Дарэчы, у наступным годзе павінна пачацца будаўніцтва раённай паліклінікі на 800 наведванняў у змену.

А ў Новай Баравой запланавана ўзвядзенне паліклінікі на 1330 наведванняў у змену. Гэты раён дынамічна развіваецца. Згодна з інвестдагаворам, да канца 2029 года тут павінна быць пабудавана 830 тысяч квадратных метраў жылля, восем дзіцячых садкоў і чатыры школы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 19 лістапада 2020 года.




## КАЛІ ПЕРАМАГАЕ ДРУЖБА, АЛЬБО... ЖАНЧЫНЫ І ФУТБОЛ

Нельга сказаць, што сувязі тут ніякай, бо цяпер ёсць нават жаночыя футбольныя каманды. Мой жа аповед з тых даўніх часоў, калі іх не было, а жанчыны добра памяталі, што яны — менавіта жанчыны.

Выключэнні, праўда, здараліся і тады. Ад футбола, як кажа сённяшняя моладзь, проста фанацела мая каляжанка Таня. З ёй і яе мужам Косцем мы працавалі ў адной школе, разам, бывала, хадзілі ў кіно, адзначалі нейкія святы, сябравалі сем'ямі. Таму я зусім не здзівілася, калі неяк пасля работы муж сказаў:

— У гэту нядзелю наша «Дынама» гуляе з кіеўскім. Цікавы будзе футбол... Я чуў, што Косця (ён жа — настаўнік фізкультуры. — **Аўт.**) арганізуе паездку... Калі будзе магчымасць, — скажы, каб мяне запісаў.

Ну чаму б і не? Я на вялікім перапынку іду шукаць Косцю, а замест яго ў калідоры сустракаю Таню. Пытаюся:

— Не ведаеш, дзе твайго мужа знайсці?

Яна мне ў адказ:

— А навошта?

— Ды, — смяюся, — улюбілася, жыць без яго не магу!

— А я пра гэта ўжо ведаю, — кажа мне Таня, прычым — на поўным сур'ёзе.

— ?!

— ...Мне данеслі, што ты хочаш яго адбіць. Дык не будзе па-твойму! Не дапушчу... Нават не спадзявайся!

Я толькі рот адкрыла: не знайшла, што і адказаць — такая мне была аплявуха. А за ёю — адразу ж званок.

Іду я ў клас і думаю: а што гэта было? Трэба разумець, нехта ў нашай школе хоча нас пасварыць — плёткі ўзяўся разводзіць? А зрэшты...

У апошні час мы з Косцем мо калі-нікалі і сустракаліся: ён рыхтаваў мяне да раённых спаборніцтваў. Праўда, гэта заўжды на людзях... І для перамогі... А тут — я раптам адбіць збіраюся... Ды не смяшыце мае пантофлі, як той казаў! Было б каго! Мужычок-сераднячок... Ды і свой жа ў мяне — каханенькі-родненькі...

«Так, — думаю, — трэба ўсур'ёз пагаварыць з Таняй — усё ёй растлумачыць. А тую — ну як падмяніў хто: чужой-чужаніцай стала!.. Праўда, на футбол, я чула, ехаць збіраецца. Значыць, трэба і мне.

З такім вось настроем мы кіруем у Мінск (Таня па-ранейшаму трымае дыстанцыю). Амаль побач сядзім на трыбунах. Праўда, я там, можна сказаць, староннім вокам гляджу, як дарослыя дзядзькі ў сямейных трусах ганяюць па полі мячык (занятак сабе знайшлі!)... І чаго толькі вакол не чую! Гвалт, свіст, тупанне нагамі, крыкі «Куды?..», «Мазіла!», «Дай пас!..», «Дурыла!», «Справа заходзь!..»

Карацей — на трыбунах эмоцыі аж кіпяць! Але і ўнізе, на полі, як быццам таксама штосць адбываецца?..

— Го-о-о-о-ол! — узрываюцца раптам трыбуны. І хтосьці балюча... б'е мяне па плячах.

Азіраюся і бачу, што чалавек той, відавочна, «не тут» — ён нічога не разумее... Як, дарэчы, і ўсе астатнія: муж мой абдымаецца з Косцем, Таня адбівае далоні, скача і вешаецца на іх... Карацей, нейкі з'езд вар'ятаў, а не стадыён! Палата нумар шэсць!

...Але ж — скажу вам — што пабывала я ў ёй недарэмна, бо пераканалася, што калі ў Мінску футбол, Мінск і ўсе, хто там ёсць, сапраўды разумнеюць.

Ва ўсякім разе са стадыёна мы выходзілі поруч з Таняй: яна па-сяброўску ўзяла мяне пад руку і нават сказала:

— Ты мне прабач. Я пра цябе дурное падумала. А тут, на футболе, убачыла: ты, каб і хацела, Косцю ў мяне аніколі не адаб'еш!

Мне аж цікава стала:

— Гэта, — пытаю, — чаму ж?

— А таму, што яго ніколі не прывабіць жанчына, якой нецікавы футбол.

Вось так. Засталося дадаць, што на раённых спаборніцтвах наша школа выйграла! Ну вядома ж, дзякуючы фізруку... Мне таксама, у пэўнай ступені. А калі наогул, то перамагла дружба.

**Зоя Максімава,**
*г. Віцебск.*

## ЯЗЫК У РОЦЕ, ЯК ЧОРТ У БАЛОЦЕ

Не вам казаць: пры камуністах людзі жылі не вельмі багата, але ж неяк без Ракфелераў — больш-менш аднолькава. У многіх грошы былі ў запасе: нехта збіраў на машыну альбо дзецям на вяселле, на новы халадзільнік, а хтосьці і проста на чорны дзень...

Розныя меліся сумы ў людзей, розныя былі і схованкі: у некага — на так званай кніжцы ў ашчадным банку, у некага — у ложку пад матрацам...

І апошні, можа, нават выйграў, бо калі распаўся Саюз, грошы без агню без дыму згарэлі — укладчыкі ні з чым засталіся.

А жыць жа за нешта трэба: і машыны купляць, і вяселлі спраўляць... Вось і кінуўся люд хто куды: хто ў гандляры-перакупшчыкі, хто ў так званыя шабашнікі, а хто з рукамі ды з галавой, той уласную справу адкрыў.

...Задумаўся пра яе і вясковец Рыгор. А што — ён жа не зломак: і гаспадар, якіх пашукаць, і працаўнік, і цесля. На падворку — свой станок з цыркуляркай, лесу вакол — хоць вазамі вазі... Ды і не з нуля ж яму пачынаць было: выконваў заказы. І проста дошкі габляваў, і вокны людзям рабіў, і дзверы...

Труны таксама, здаралася. Як жа адмовіш, калі ў чалавека бяда? Тут нават бясплатна зробіш... Ці хіба натурай возьмеш колькі пляшак гарэлкі ды закусь, каб нябожчыка памянуць...

Дык чаму б, падумаў, не ўзяцца за вытворчасць, не паставіць яе на паток? Людзі ж і паміралі, і будуць паміраць, значыць, банкруцтва яму не пагражае. Канкурэнтаў паблізу таксама няма. Гэта цяпер на рытуальных паслугах людзі бізнес робяць, а тады...

Тады да Рыгора чарговы заказчык зайшоў — знаёмец з суседняй вёскі, папрасіў, каб для яго бацькі труну зрабіў. А яшчэ — каб заўтра а дзявятай раніцы прывёз яе, бо самому забраць — ну ніяк не выпадае.

Рыгор — чалавек слова: паабяцаў і тут жа, без адкладу, за работу ўзяўся.

...Раніцай, каб даставіць заказ, яшчэ ўпоцемках пагаліўся-прыбраўся — пайшоў заводзіць свой стары «Масквічок», а той, як на ліха — ні гуку! Гаспадар і так ля яго, і вось гэтак... Што ні рабіў, — толькі час змарнаваў: не завялася машына.

Ён тады (што рабіць?!) ускінуў дамавіну сабе на плечы (вечка, вырашыў, другім заходам вазьму) і пехам падаўся да вёскі, балазе гэта блізка было — напрасткі, узбоч могілак, недзе з вярсту...

І з палову яе вясковец ужо прайшоў, калі пачуў, што ззаду едзе машына, і ўбачыў (справа ў позднюю восень была — толкам не развіднела), што яна — міліцэйская — ужо дагнала і абагнала яго, потым — спынілася, стала здаваць назад.

— Э-э, што нясеш? — спытаў у Рыгора іх новы, малады зусім участковы. — Труну?! Ты дзе яе ўзяў?

А Рыгору ж часу няма, каб з ім лясы тачыць: як ішоў, так ідзе ды скардзіцца:

— Ды вось жа... Пакрыўдзіла мяне радня: не там пахавала... Я ў іншае месца рашыў перайсці...

Той хлопец, як пачуў гэта, так на зямлю і аб'ехаў — знежывеў, брыдак.

Рыгор тут жа труну з плячэй, да машыны яе прыставіў, нахіліўся да ляжачага, паляпаў рукой па твары, сказаў:

— Браток, мы ж так не дамаўляліся... Пажартаваў я... Прабач.

...Праўду кажуць, што з добрага смеху добрая і пацеха, а дурныя жарты часам стрэсу варты.

**Мікалай Багданаў,**
*Мёрскі раён.*

## ДЗЕНЬ РУЖОВЫХ РУЖ

Кажуць, колькі людзей, столькі меркаванняў. Аднак з гэтым можна паспрачацца, бо яны, тыя меркаванні, часта супадаюць, а вось лёсы — не: у кожнага чалавека ён свой, асабісты. Хтосьці, напрыклад, з першых дзён і да скону ў любові ды дастатку жыве, хтосьці — у хваробах ды горы: то з бацькамі не пашчасціла, то з мужам ці жонкай, то з дзецьмі, з работай, з начальствам... А найчасцей, відаць, і сапраўды жыццё «ў палосачку». Толькі палоскі гэтыя рознай шырыні і рознага колеру.

У маёй прыяцелькі Алёны светлых, дзякаваць богу, болей: вырасла ў поўнай сям'і, скончыла інстытут, выйшла замуж, нарадзіла дачку... Праўда, гадавала яе, можна сказаць, адна, бо муж — як цешча казала — «увесь час у камандзіроўках сядзеў», прычым доўжыліся яны не днямі і нават не тыднямі: па паўгода чалавека дома не было! Потым прыедзе, трохі пабудзе — і зноў няма.

Алёна, вядома ж, і злавала на яго, і крыўдавала, бо «все подружки по парам...», а яна ўсё адна ды адна... І ў будні — яшчэ палова бяды...

У іх якраз чакалася свята — дзесяцігоддзе сумеснага жыцця — бурштынавае вяселле. І без «жаніха»...

«Нічога не зробіш», — вырашыла «нявеста», і разам з дачушкай так, на ўсякі выпадак, прыбралі ў кватэры, напяклі бацькавых любімых пірагоў, зрабілі прыгожыя прычоскі, надзелі новыя сукенкі — схадзілі ў іх у парк пагуляць. А калі вярнуліся дамоў, адчынілі дзверы...

Алёна, што называецца, дзе стаяла, там і села: пасярод залы на століку красаваўся велізарны букет — ружы, яе любімыя, ружовыя.

— Татка прыехаў! — закрычала малая і, сарваўшыся з месца, пабегла шукаць яго па кватэры.

Азірнулася па баках і Алёна — нідзе аніякіх прыкмет: ні чамадана, ні плашча, ні абутку.

— У спальні яго няма, — тым часам дакладвала малая. — За шторай таксама няма. Можа, ён у кухні?..

Дзіця аббегла ўсе закуткі, праверыла ўсе магчымыя схованкі і развяло рукамі: не прыехаў... Тады адкуль узяліся кветкі?

Не разумела гэтага і Алёна, пакуль пад вечар муж не пазваніў, не павіншаваў і не сказаў, што дастаўку падарунка (пры букеце была і каробачка з пярсцёнкам) разам з ключамі ад кватэры даверыў сябру, што быў сведкам у іх на вяселлі.

...Іншымі словамі, нягледзячы на адлегласць, свята ў гэтай сям'і адбылося! Што, напэўна, і не дзіва, бо яно заўжды адбываецца, калі двое па-сапраўднаму любяць.

**Ірына Кулікова,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж заўсёднае:** «Пішыце!» Конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца, журы працуе. Шанцы на перамогу ёсць.*

Неасабісты суб'ектыў



# Хвіліна маўчання

### На якой вайне мы становімся і салдатамі, і ахвярамі

УЧОРА акурат апоўдні здарылася са мной надзвычай непрыемная неспадзяванка. Камп'ютар на рабочым стале, на экране якога ўжо было наадкрывана з дзясятак «вокнаў» і для работы, і «пагля дзець», раптам без аніякага папярэджання ўсе гэтыя «вокны» патушыў, заліў манітор валошкава-сінім колерам і здзекліва напісаў: «Не выключайце камп'ютар. Устанаўліваецца абнаўленне». Збянтэжана пасядзеўшы перад ім хвілін пятнаццаць і патыкаўшы ў розныя кнопкі, я зразумела, што чакаць давядзецца доўга: працэнт загрузкі абнаўленняў паказваў лічбу «два», і павялічвацца яна не спяшалася. Але на гэтым непрыемнасці не скончыліся. Узяўшыся за смартфон, я ўбачыла, што апаратар вырубіў мне мабільны інтэрнэт (забылася заплаціць). Гэту праблему можна было б лёгка вырашыць: праз сеціва аплаціць — дзве хвіліны. Але дзе ж тое сеціва — здзекліва-роўна свеціць васільковага колеру манітор. Не ісці ж па рэдакцыі прасіцца за чужы камп'ютар — людзі самі працуюць.

Я ўвогуле чалавек да панікі не схільны. Але тут нешта падобнае на некалькі хвілін адчула. Спачатку я не ведала, куды падзець рукі — яны ж звычайна ці на клавіятуры, ці на мышы. Праз колькі часу я ўжо не ведала, куды падзець саму сябе: пісаць трэба, пошту ўжо дзесяць хвілін не глядзела, а там жа навін колькі, напэўна, новых, а «Фэйсбук», а «Тэлеграм»... Карацей, некалькі разоў устаўшы, зноў сеўшы, зноў устаўшы, пахадзіўшы па калідорах, я рашыла пайсці на вуліцу. На сінім маніторы два працэнты змяніліся на чатыры, тым самым даючы надзею, што калі-небудзь ён усё-ткі запрацуе.

ПАД пранізлівым сцюдзёным ветрам, які дзьмуў проста ў твар, я рушыла ў недалёкі парк Чалюскінцаў. Прайшла крыху ўглыб па алеях і раптам здзівілася цішыні, якая была вакол. Не было чуваць недалёкага праспекта, вецер згубіўся недзе ў верхавінах сосен. Людзей вакол не было — аніводнага чалавека. Прысеўшы на лаўку, я злавіла сябе на тым, што ўпершыню за доўгія-доўгія месяцы я ў разгар рабочага дня маўчу ў цішыні.

Спачатку ад гэтага ўзаемнага з наваколлем маўчання было неяк няёмка і нязручна. А пасля прыйшло разуменне, што гэта я сама перад сабой сапраўдная. Можна нарэшце прыслухацца не да некага — да сябе і зразумець, што насамрэч для мяне важна і што на самай справе мяне хвалюе ў гэтым жыцці. Уключыліся зусім іншыя эмоцыі, той настрой, які міжволі «нахапала» з раніцы з сацыяльных сетак і «Тэлеграма», знік, бо прыйшло разуменне, што гэта не мой настрой, а нечы, некага іншага, каго я нават не ведаю. І самым важным у жыцці, нашмат важнейшым, чым усё іншае, аказалася тое, што хросная дачушка нядаўна ляжала ў бальніцы, а я з-за каранавіруса не магу адвезці ёй купленую ляльку, якую яна так чакала. Што кошка сёння раніцай ледзь не пакалечыла лапу, бо бесталковая гаспадыня ўжо каторы вечар не можа пастрыгчы ёй кіпці — позна прыходжу, а яшчэ ж трэба навіны паглядзець, каментарыі напісаць, лайкі паставіць, настрой самой сабе сапсаваць. Што час шаткаваць капусту, а я так і не схадзіла на наш імправізаваны рынак, дзе дзядзька з-пад Турава кожны год пакідаў мне самыя крамяныя галоўкі. Я нарэшце змагла задумацца і прааналізаваць, ці падабаецца мне амаль дачытаны, модны сёння «Жэтон на метро», бо чытала, едучы ў тралейбусе, упохапкі, на смартфоне, паралельна гледзячы навіны, пішучы каментарыі, ставячы лайкі. І думаць, падабаецца ці не, не было часу, і чытала дзеля таго, каб быць у трэндзе, каб не выглядаць дурніцай, калі хтосьці спытаецца...

І ў гэту хвіліну маўчання і развагі прыйшла яшчэ вось якая думка. Многія з нас, асабліва жыхары гарадоў, перасяліліся з рэальнага жыцця туды, у віртуальную прастору. І пражываем там сваё жыццё — спачуваем тым, каго не ведаем і ніколі не ўбачым, клянём тых, хто нам асабіста не зрабіў нічога дрэннага, эмацыянальна рэагуем на тое, чаго на свае вочы не бачылі, на свае вушы не чулі, урэшце, робім тое, што, як думаем, хочам самі, а насамрэч тое, хто хоча хтосьці іншы. Прыгадайце: за апошнія месяцы быў жа нехта са знаёмых, хто казаў пра непрыбіраную некалькі тыдняў кватэру, засохлыя, забытыя кветкі, пакінутых без звыклых вечаровых гульняў дзяцей. Бо не да таго — бо мама ў «Фэйсбуку» піша каментарыі, рэпосціць «жудасныя навіны», бо тата, толькі прыйшоўшы з працы, завісае ў «Тэлеграме», а пасля злуецца, лаецца, становіцца зусім не падобны на сябе ранейшага. А можа, гэта не пра вашых знаёмых, а пра вас саміх?..

Цяпер многа гаворыцца пра тое, што супраць нашай краіны вядзецца гібрыдная вайна. Пэўна, так яно і ёсць, і гэта дрэнна. Але здаецца мне, што ёсць рэч значна горшая, з якой ніякі спецыяліст па барацьбе з кіберзлачыннасцю не справіцца. Гібрыдная вайна, якую кожны з нас аб'яўляе сабе сам. Уключаючы камп'ютар ці смартфон, мы з «гома сапіенс» ператвараемся ў «гома гаджэтус», у салдат і адначасова ў ахвяр гэтай самай вайны, у якой не можа быць пераможцаў. Але страшна не гэта, а тое, што з-за ўдзелу ў такой вайне мы псуём іншым людзям і самім сабе рэальнае жыццё — кароткае, якое не перазапусціш на абнаўленне.

НАМ сёння ўсім вельмі патрэбна проста спыніцца і памаўчаць у цішыні. Прыслухацца не да кагосьці — да саміх сябе, расставіць не нечыя — свае ўласныя прыярытэты. Для гэтага дастаткова націснуць на «выключыць». Гэта часам вельмі складана і цяжка, але ж мы з вамі не шукаем лёгкіх шляхоў?..

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

Таямніцы айчыннай гісторыі

# ПІЯНЕРЫ-

## Як у Бабруйску знайшлі беларускага

**Ад рэдакцыі. Змяняюцца часы, змяняюцца ацэнкі падзей і асоб... Але нешта мусіць заставацца непарушным — прынцыпы гуманізму, агульначалавечыя каштоўнасці. Гісторык «бесстаронні», ён мае справу з фактамі. Нават калі яны камусьці не падабаюцца, падаюцца занадта жорсткімі, рушаць стэрэатыпы. Вядомы даследчык Аляксандр Гужалоўскі працягвае раскрываць для чытачоў «Звязды» таямніцы беларускага мінулага.**


ПОСТУПИЛО 6 ФЕВ 1940
29 I 1940 года
75

Дарагі наш бацька Сталін!
Мы дзеці Беларусі пішым да Цябе пісьмо
і дзякуім Табе і Чырвонай Арміі за вызваленя
нас с пад панскаго гнёта. Мы радуімся што
вольныя а смуцімся што галодныя. цяпер у нас
німа дзе купіць хлеба. У нас хлеп дарагі адзін
пуд жыта стоіць 25 рублей. а на 25 рублей
наш бацька працуе 5 дзён. Наш бацька ні
можа зарабіць хлеба для нас бо наша
маці хворая а нас чацьвёра і усе малыя
я маю 14 год мая сястра 12 год. адзін брат
10 а другі 7. Сястра мая ходзіць да 4 класа
пачатковай школы а я хачу хадзіць да 5


класа пачатковай школы.
Я хачу быць лётчыцай слаўнай у целім
свеце Мая сястра хоча быць капіта-
нам на караблі. Мы моцна хочым вучыцца
мы спадзяёмся што нашыя мары збудуцца
праўдай.
Мы Табе наш бацька жэлаем доўгаго жыцця
Евгенія і Ольга Мусніцкія
БССР область Баранавічы.
уезд Валожына
волость Прабы
вёска Сінкіната.

Адным з цэнтральных паняццяў савецкай ідэалогіі сталінскіх часоў быў «новы чалавек» — фізічна і разумова развітая асоба, якая прытрымліваецца прынцыпаў калектывізму, добраахвотна падпарадкоўвае ўласныя інтарэсы грамадскім, а таксама гатовая ахвяраваць сябе і сваіх крэўных у імя ідэі пабудовы бяскласавага грамадства. Найбольш важнымі ўзроставымі катэгорыямі ў гэтым сэнсе былі дзеці і падлеткі, іншымі словамі, вучні школ ва ўзросце ад 7 да 17 гадоў. У іх калектыўнай свядомасці прапаганда актыўна стварала светлы вобраз Сталіна.

За дзень да расстрэлу Зіноўева, Каменева і яшчэ 14-ці абвінавачаных па першым маскоўскім працэсе газета «Піянер Беларусі» надрукавала зварот піянераў фарпоста № 1 пры жакце № 14 г. Мінска да Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР. Фаня Іодэс, Хіля Вінэр, Сёма Падастравец, Заля Кузьмінскі і Сролік Эльтэрман прасілі, «...каб да гэтых подлых нягоднікаў прывялі вышэйшую меру пакарання. Мы хочам і будзем жыць, вучыцца і расці пад кіраўніцтвам нашага дарагога, любімага таварыша Сталіна». Аднačасова з асуджэннем «подлых бандытаў, якія зрабілі замах на забойства нашага дарагога сэрца краіны — І. В. Сталіна», выхавацелі вучылі дзяцей дзякаваць «работнікам НКУС, якія пільна сочаць і ахоўваюць любімых правадыроў усяго працоўнага чалавецтва». Другі маскоўскі працэс, які прайшоў у студзені 1937 года, таксама суправаджаўся правядзеннем «хвілін нянавісці» ў дзіцячых калектывах. Пасля надрукавання ў газетах, у тым ліку ў «Піянеры Беларусі», смяротнага прысуду групе высокапастаўленых партфункцыянераў, школьнік з Краснага Берага Жлобінскага раёна Мордас абурана здзіўляўся: «Падумаць толькі: яны хацелі забіць нашага любімага Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, які даў нам шчаслівае жыццё... Бандыты, шпіёны атрымалі па заслугах. Гэтаму я вельмі рад». Усё паўтарылася ў сакавіку 1938 года падчас трэцяга маскоўскага працэсу.

## «Спі, дачушка мая Валя...»

Для ўздзеяння на дзіцячую свядомасць выкарыстоўваліся такія эмацыянальна насычаныя сродкі, як вершаванае слова і музыка. Месца цэнтральнага вобраза прапаганды ў гэтых жанрах трывала заняў Сталін. Так, у 1934 годзе ў беларускіх піянераў з'явілася ўласная песня пад назвай «Піянерская-першамайская» сумеснай вытворчасці паэта Петруся Броўкі і кампазітара Іванова. На працягу наступных двух дзесяцігоддзяў на сотнях імпрэзаў тысячы дзяцей з энтузіязмам запявалі яе прыпеў: «Крылатых самалётаў над горадам кругі, / На маўзалей выходзіць наш Сталін дарагі. / Яму зямля саветаў, рабочыя сусвета / І мы свой піонерскі шлём салют». У наступным годзе з'явілася «Піянерская песня», напісаная Сяргеем Грахоўскім, таксама ўсхваляўшая правадыра: «Мы ўмеем спяваць і смяяцца, / Мы ніколі не ведаем слёз. / Дзецям розных рэспублік і нацый / Сталін даў найшчаслівейшы лёс».

У разгар вялікага тэрору ў друку з'явіўся паэтычны зварот Броўкі да свайго сына. Верш відавочна не адносіўся да паэтычных адкрыццяў, тым не менш ён цікавы сімвалічнай перадачай паэтам уласных бацькоўскіх функцый правадыру. Некаторыя радкі звароту паэта да сына гучаць як развітальныя, нібыта складзеныя ў чаканні арышту, які ў 1937 годзе мог адбыцца ў любую хвіліну:

*Сягоння зноў узняты свет,*
*Грыміць комуны марш.*
*Мой сын, ты чуеш, у Маскве*
*Гаворыць бацька наш.*
*Не спі, маленькі, мой герой,*
*Шчаслівы у жыцці,*
*Заўсёды будзе ён з табой...*
*Расці, мой сын, расці.*
*Ты сонца яснае пазнаў,*
*Ты будзеш з ім ісці,*
*Ён нас усіх узгадаваў...*
*Расці, мой сын, расці!*

Калі Броўка імем дыктатара будзіў свайго сына, то Эдзі Агняцвет падобным чынам закалыхвала беларускіх немаўлят у стылізаваных пад народныя вершах:

*Спі, дачушка мая Валя,*
*І равеснік твой Віталій,*
*Вас жа любіць мудры Сталін.*
*Хачу, каб вы падрасталі,*
*Перад вамі шчасця далі,*
*Вас жа любіць мудры Сталін.*

## «Мы радуімся што вольныя, але смуцімся што галодныя»

Значнай колькасці дзяцей і падлеткаў сталінскага пакалення давялося сутыкнуцца з праблемай неадпаведнасці навакольнай рэчаіснасці карціне свету, якую навязвала зверху моцная прапагандысцкая машына. Асабісты жыццёвы вопыт, які супярэчыў ідэалагічным установкам, прыводзіў да здзіўлення, прасвятлення, расчаравання і нават неўсвядомленага пратэсту. Выдаткоўваючы велізарныя сродкі на камуністычнае выхаванне дзяцей, сталінскі рэжым часта не быў у стане задаволіць у поўным аб'ёме іх базавыя патрабаванні.

У 1932 годзе карэспандэнт часопіса «Работніца і калгасніца Беларусі» пісаў пра выхаванцаў яўрэйскага піянердома імя Сталіна, якія ў адсутнасці вады «ноччу бегалі на вуліцу і глыталі сьнег». У аператыўным данясенні АДПУ, якое паступіла ў ЦК КП(б)Б у 1934 годзе, паведамлялася пра негатыўныя настроі рабочых мінскіх прадпрыемстваў, выкліканыя дрэнным забеспячэннем харчамі. Адным з незадаволеных быў ударнік Грышын, дзеці якога, паводле яго слоў, «паляглі ад голаду». У тым жа данясенні прыгадваўся трактарыст Дзямідчык, які на вытворчай нарадзе заявіў: «Я хачу працаваць, толькі дайце хлеба на ўтрыманцаў, бо з 600 грам хлеба, якія я атрымліваю, я нічога не ем — аддаю дзецям, і ўсё ж адно маё дзіця захварэла ад недаядання». У гады трэцяй пяцігодкі, у «краіне, дзе перамог сацыялізм», беларускія дзеці ўжо наўпрост звярталіся да Сталіна па бохан хлеба. 29 студзеня 1940 года сёстры Мусніцкія з вёскі Сінкіняты Валожынскага раёна пісалі правадыру: «Дарагі наш бацька Сталін! Мы дзеці Беларусі пішым да Цябе пісьмо. Дзякуем Табе і Чырвонай Арміі за вызваленя нас з пад панскага гнёта. Мы радуімся што вольныя, але смуцімся што галодныя. Цяпер у нас німа дзе купіць хлеба. У нас хлеб дарагі, адзін пуд жыта стоіць 25 рублей, а на 25 рублей наш бацька працуе 5 дзён».

Разам са значнымі колькаснымі паказчыкамі, дасягнутымі на працягу 1930-х гадоў у галіне школьнай адукацыі, меліся недахопы, звязаныя з якасцю вучэбнага працэсу і атрыманых ведаў. На якасныя паказчыкі дрэнна ўплывалі, перш за ўсё, фарсіраваныя тэмпы развіцця школьнай сеткі, а таксама палітызацыя зместу адукацыйнай і выхаваўчай работы. У сваім справаздачным дакладзе на XVI з'ездзе КП(б)Б, зробленым 11 чэрвеня 1937 года, Шаранговіч паведаміў, што ў 1934/35 навучальным годзе ў школах БССР было пакінута на другі год 66 тыс. вучняў, у 1935/36 годзе іх колькасць вырасла да 110 тыс. У 1936/37 навучальным годзе ў школах рэспублікі не хапала больш за 1,5 тыс. настаўнікаў. У асоб, якія працавалі ў школах БССР, адукацыйны ўзровень вымушаў жадаць лепшага. Так, 62 % настаўнікаў 1—4-х класаў не мелі сярэдняй адукацыі, а з агульнай колькасці настаўнікаў 5—10-х класаў толькі 25 % мелі вышэйшую адукацыю. Паводле афіцыйных звестак Наркамата аховы здароўя, у 1938 годзе каля 80 % хворых на сыпны тыф у БССР складалі дзеці, а вашывасць сярод школьнікаў у залежнасці ад мясцовасці даходзіла да 60 і нават 70 %.

Гэтыя адмоўныя з'явы выклікалі непакой у партыйнага кіраўніцтва рэспублікі. Але ўсе недахопы, якія існавалі ў сістэме народнай адукацыі, спісвалі на выканаўцаў. Вельмі небяспечнай была пасада народнага камісара асветы БССР. Пасля самагубства Усевалада Ігнатоўскага і адпраўкі на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала Баліцкага, ахвярамі вялікага тэрору 1937—1938 гадоў зрабіліся наркамы адукацыі Платун (1929—1933), Чарнушэвіч (1933—1936), Дзякаў (1936—1937), Варончанка (1937) і Півавараў (1937—1938). Міністр асветы БССР Саевіч (1947—1951), перш чым апынуцца ў 1951 годзе ў «амерыканцы», таксама неаднаразова рабіўся аб'ектам публічнай крытыкі.

## «Яны сінія, дрыжаць ад холаду, ціснуцца па кутах»

Напоўніцу давялося спазнаць адваротны бок жыцця сталінскага грамадства беспрытульнікам. Калектывізацыя, неад'емнай часткай якой было прымусовае высяленне раскулачаных сялян, выклікала напачатку 1930-х гадоў рэзкае павелічэнне ў БССР колькасці беспрытульных дзяцей. Сітуацыю яшчэ пагоршылі міграцыі ў рэспубліку дзяцей з ахопленых голадам Украіны і паўднёвых раёнаў РСФСР у 1932—1933 гадах. Асноўнымі заняткамі беспрытульнікаў былі крадзеж, папрашайніцтва, наркаманія, прастытуцыя. Сітуацыю, што склалася ў рэспубліцы, зафіксавала пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 27 красавіка 1934 года. «Аб ліквідацыі дзіцячай беспрытульнасці», дзе з характэрнай для таго часу безапеляцыйнасцю быў вызначаны канкрэтны тэрмін суцэльнай ліквідацыі беспрытульнасці — 15 мая 1934 года.

У красавіку 1935 года, праз год пасля прыняцця згаданай пастановы, старшыня Цэнтральнай дзіцячай камісіі пры ЦВК БССР Чарвякоў у дакладной, адрасаванай у ЦК КП(б)Б, канстатаваў, што яна ў большасці пунктаў не выканана. Так, не былі пабудаваны рэфарматорыум для непаўналетніх у Чэрвені, спецыяльная фабрычна-заводская вучэльня ў Віцебску, а таксама працоўная калонія пры Галоўным упраўленні міліцыі. Характарызуючы становішча ў беларускіх дзіцячых дамах, усебеларускі староста пісаў пра раскраданне маёмасці, «голых, брудных, вашывых, галодных» выхаванцаў, а таксама выпадкі педафіліі. Нягледзячы на тое, што на працягу 1934 года праз прыёмнікі ў гарадах БССР было прапушчана больш за 7 тыс. (з іх 1 082 у Мінску) беспрытульных і безнагляданых дзяцей, паводле звестак Чарвякова, на вуліцах беларускіх гарадоў заставалася больш за 1,5 тыс. дзяцей абедзвюх катэгорый. Каля 70 % ад 7 тыс. беспрытульнікаў, прапушчаных праз прыёмнікі, складалі прыбылыя з вясковых мясцовасцяў БССР, УССР і РСФСР дзеці раскулачаных, а таксама высланых або памерлых аднаасобнікаў. Не спынялася таксама плынь збеглых з дзіцячых устаноў як вынік дрэннага з імі абыходжання.

Неад'емнай часткай сталінскай культуры дзяцінства была дыскрымінацыя дзяцей з разумовымі адхіленнямі. Пра гэта сведчыць наступны фрагмент са справаздачы камісіі Наркамата аховы здароўя, якая 24—25 кастрычніка 1938 года абследавала дзіцячае аддзяленне Магілёўскай псіхіятрычнай лякарні: «Памяшканне вільготнае, змрочнае, не ацяпляецца. Большасць дзяцей босыя, напаў- ці зусім голыя. Яны сінія, дрыжаць ад холаду, ціснуцца па кутах. Выглядаюць неахайна і ўсе разам нагадваюць загнаных звяроў. Па словах адміністрацыі, маецца ўсяго 44 хворых. Імбецылы, ідыёты і ўсе астатнія трымаюцца разам, і вядома, сумеснае сужыццё наганяе жах на ўсіх і дэградуе дзіцячы калектыў у цэлым. Ніякай працы — ні медыцынскай, ні санітарнай, ні выхаваўчай у гэтым аддзяленні чамусьці не вядзецца. Урача ў ім не маецца, працу вядзе старэйшая сястра, і пры неабходнасці лячэбнай дапамогі туды заходзіць дзяжурны фельчар».

## Не пашкадаваць уласнага бацькі дзеля пабудовы светлага «заўтра»

Любоў, адданасць калектыўнаму бацьку, паводле задумы сталінскіх выхавальнікаў-прапагандыстаў, спалучаліся з жорсткімі, бязлітаснымі адносінамі да родных бацькоў у выпадку іх «сацыяльна шкодных» паводзін. У 1930 годзе на Усебеларускім конкурсе дзіцячай кнігі была прэміравана аповесць Алеся Якімовіча «Перамога». Яе галоўны і безумоўна станоўчы герой — падлетак Сцёпка паведамляў старшыні калгаса пра шкодніцкую дзейнасць свайго бацькі. Сюжэт гэтага першага беларускага літаратурнага твора, які адкрыта заклікаў дзяцей да даносніцтва на ўласных бацькоў, меў адносна шчаслівы фінал. Атрымаўшы 5 гадоў умоўнага зняволення, падкулачнік-бацька ўступіў у калгас.

# ПАКУТНІКІ

## Паўліка Марозава

З цягам часу сюжэтныя лініі твораў беларускай літаратуры, прысвечаных вобразам дзяцей-даносчыкаў, набывалі больш злавесны характар. Напрыклад, галоўны герой напісанай у 1934 годзе Александровічам паэмы «Шчаслівая дарога» — сын кулака Грышка — паведамляе органам не толькі пра бацьку, але таксама пра старэйшую сястру, якая паспрабавала збегчы ад калектывізацыі ў Польшчу. У выніку Грышку перадалі ў інтэрнат, а яго арыштаваныя бацька і сястра зніклі ў нетрах ГУЛАГу. Падобны сумны лёс напаткаў героя драмы Эдуарда Самуйлёнка «Пагібель воўка» — лесніка Багдана Харкевіча, якога публічна выкрыла як «дыверсанта і класавага ворага» дачка-студэнтка.

Пасля забойства ў верасні 1932 года Паўліка Марозава пачаў фарміравацца і атрымаў шырокае развіццё культ піянера-пакутніка, які не пашкадаваў уласнага бацькі дзеля пабудовы светлага «заўтра». Пра «мужны ўчынак» Паўліка школьнікам расказвалі на ўроках. Пра яго складалі паэмы, пісалі песні і нават оперы. Пасля прапановы Максіма Горкага аб узвядзенні Паўліку Марозаву помніка ў Маскве піянерская арганізацыя БССР адразу пачала збор сродкаў на яго пабудову. Першыя на гэтую справу пералічылі чатыры рублі піянеры аршанскай базы «Металіст». Кампанія збору сродкаў на помнік працягвалася ў Савецкай Беларусі таксама ў наступным годзе пад дэвізам «Будзем як Паўлік». Імем апошняга была названа «вуліца» ў піянерлагеры Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната.

Адначасова беларускі піянерскі друк паведамляў пра іншых піянераў-пакутнікаў, якія, натхніўшыся «подзвігам» П. Марозава, данасілі ў НКУС пра супрацьзаконныя дзеянні сваякоў. Паведамленні накшталт «смерцю Паўліка Марозава на Каўказе загінуў Грыша Акопаў», «у Краснаярскім краі ў вёсцы Шыра забіт Гена Шчукін» правакавалі беларускіх дзяцей на аналагічныя ўчынкі. Беларускі літаратар Алесь Рылько расказваў Янку Брылю, што ў 1930-х гадах «...начытаўшыся ды наслухаўшыся пра подзвіг Паўліка Марозава, пачаў сачыць за сваім бацькам. Калгасны конюх, бацька прыносіў часам кішэню аўса, з якога, растоўкшы яго ў ступе, маці варыла нейкую поліўку. І вось аднойчы, пільнуючы са школы, малы сеў пісаць на бацьку заяву. — Думаў, думаў, — успамінаў ён потым, у пяцідзясятых, — а пасля як стала мне страшна, як расплакаўся я за сталом!..»

### Выдатнік і сын шаўца

Знайсці свайго Паўліка Марозава прапагандысты КП(б)Б здолелі толькі ў 1937 годзе. Ім стаў 14-гадовы вучань 2-й барысаўскай рускай школы, піянер, выдатнік і сын шаўца Меер Меркінд.

Паводле ўспамінаў тагачаснага аператыўнага ўпаўнаважанага крымінальнага вышуку Стара-Барысава Брыжэўскага, у 1936 годзе ён завербаваў Меера з дапамогай іншага школьніка, які добраахвотна дапамагаў міліцыі. Уласцівае падлетку абвостранае пачуццё справядлівасці, нецярпімасці да крывадушша і фальшу было добрай глебай для ўкаранення міфа пра «ўсеагульнае шчасце». У выніку размовы пра «перавыхаванне злачынцаў, што з'яўляецца адной з найважнейшых умоў пабудовы сацыялістычнага грамадства» хлопец даў згоду даносіць на свайго бацьку. Меркінда-старэйшага барысаўская міліцыя даўно падазравала ў вырабе і продажы абутку з кантрабанднай скуры і, адпаведна, у сувязях з кантрабандыстамі. Паводле правіл сапраўднага дэтэктыва, Меер сачыў за бацькам, падслухоўваў яго размовы, таемна сустракаўся з агентамі крымінальнага вышуку для перадачы інфармацыі і, самае галоўнае, знайшоў у хаце рэчавыя доказы злачынства — схованкі з кантрабанднымі скурамі.

У сваіх успамінах Брыжэўскі піша, што разумеў смяротную небяспеку, якой падвяргаў свайго малалетняга тайнага агента, бо ў выпадку нейкай памылкі кантрабандысты яго б не пашкадавалі. Таму ў абмен на пісьмовую заяву аб незаконнай дзейнасці бацькі Меркінду з боку барысаўскай міліцыі былі дадзены гарантыі канфідэнцыяльнасці і абяцанне не прыцягваць у якасці сведкі абвінавачання падчас судовага працэсу. Аднак неўзабаве пасля арышту разам з групай кантрабандыстаў Меркінда-старэйшага, падзеі пачалі разгортвацца паводле іншага сцэнарыя. Высока ацаніўшы прапагандысцкі патэнцыял гэтай крымінальнай справы і з'яўленне, нарэшце, беларускага Паўліка Марозава (хай нават і не забітага ворагамі), партыйнае кіраўніцтва рэспублікі вырашыла зрабіць працэс адкрытым і шырока асвятляць яго ў друку.




11 мая 1937 года ў перапоўненай зале Дома селяніна барысаўскі суд пачаў слуханне справы па абвінавачванні брыгадзіра шавецкай арцелі «Чырвоны воін» Меркінда ў крадзяжы скуртавараў, вырабу з іх абутку і продажы па спекуляцыйных цэнах. Да таго часу партыйныя прапагандысты ўжо прапанавалі суду іншую версію падзей, якая гераізавала дзеянні юнага піянера. Так, карэспандэнт газеты «Звязда», які асвятляў гэты працэс, паведамляў з перапоўненай залы суда: «Меер Меркінд яшчэ ў 1936 годзе заявіў міліцыі аб злачынстве бацькі, але міліцыя ніякіх мер не прымала. У пачатку 1937 года піянер Меркінд прышоў да ўпаўнаважанага крымвышуку і, расказаўшы падрабязна пра злачынствы яго бацькі, ён дадаў: — Калі і на гэты раз будзеце маўчаць, я выкрыю і вас перад Галоўным кіраўніцтвам міліцыі». Меера абавязалі выступаць на судзе ў якасці сведкі супраць свайго бацькі. Паводле слоў карэспандэнта «Звязды», дзякуючы яго выступленню, суду ўдалося выявіць новых злачынцаў.

Працэс барысаўскіх кантрабандыстаў-спекулянтаў шырока асвятляўся ў беларускім друку. У кожным рэпартажы асаблівы націск рабіўся на «гераічны ўчынак» барысаўскага падлетка, за які ён атрымаў пуцёўку на адпачынак у піянерскім лагеры «Артэк». «Піянер Беларусі» наўпрост назваў хлопца, які стаў ахвярай савецкай прапагандысцкай машыны, «беларускім Паўлікам Марозавым».

Тым не менш крымінальна-прапагандысцкая аперацыя пад назвай «беларускі Паўлік Марозаў» мела сумны фінал. Меркінд-старэйшы атрымаў працяглы тэрмін зняволення, яго лёс губляецца ў ГУЛАГу. Меера неўзабаве пасля вяртання з «Артэка» перадалі на выхаванне ў віцебскі дзіцячы дом. У апошні перадваенны год ён паступіў вучыцца ў Мінскі педінстытут. Паводле ўспамінаў барысаўскага краязнаўца Разэнблюма, у жніўні 1941 года Меер Меркінд загінуў на фронце. Але паведаміць пра гэта не было каму, бо ў яго дакументах у графах «бацька» і «маці» стаялі прочыркі.

**Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ,**
**доктар гістарычных навук.**

# «Зараз такі хуткі, зменлівы і багаты на падзеі час, што хочацца мудрасці і цішыні»

## Адам Глобус любіць метаметафарыстаў і часам бярэ грошы за пытанні



**Ён не баіцца выказвацца шчыра і адкрыта, ён можа быць парадаксальным, адначасова жорсткім і мудрым. Карацей, кожная сустрэча з настолькі яркім і таленавітым чалавекам, якім з'яўляецца беларускі пісьменнік і мастак Адам Глобус, — сапраўднае адкрыццё.**

Зрэшты, інтэлектуальны складнік ягонай асобы быў прадвызначаны — Адам Глобус, ён жа Уладзімір Адамчык, вырас у літаратарскім асяроддзі: ён гадаваўся ў доме на Карла Маркса, дзе жылі Уладзімір Караткевіч, Янка Брыль, Іван Навуменка ды іншыя класікі, якія для яго былі проста суседзямі. Бацька, Вячаслаў Адамчык, — вядомы пісьменнік; брат, Міраслаў Шайбак, таксама зрабіўся пісьменнікам. А Глобус — дарэчы, не прыдуманы псеўданім, а прозвішча маці, настаўніцы, бібліятэкаркі.

Ён умее прыцягваць да сябе ўвагу. У свой час кніга Адама Глобуса пад назвай «Сучаснікі», з націскам на першы склад, выклікала сапраўдны скандал: там апісваліся пісьменніцкае закулiссе, пазбаўленае забранзавеласці. А былі яшчэ і эратычны «Дамавікамерон», які ўразіў смеласцю постсавецкае грамадства; вершы, што зрабіліся тэкстамі культавых рок-гуртоў, юбілейная выстаўка малюнкаў «18+», на якую сабраўся ўвесь беларускі бамонд, дый шмат чаго іншага...

***— У адным з вашых інтэрв'ю я прачытала, што руская літаратура XX стагоддзя не паўплывала на вас. Таму хачу спытаць, ці ёсць сярод сучасных рускіх пісьменнікаў тыя, каго вы вылучаеце?***

— А тых пісьменнікаў, што пішуць па-руску і жывуць у Амерыцы, таксама ўлічваць?

***— Напэўна, залежыць ад таго, аб чым яны пішуць.***

— А мне здаецца, што ўсё залежыць ад рускай мовы. Калі пішаш па-руску, ты рускі пісьменнік. Напэўна, у тым інтэрв'ю я не зусім дакладна сказаў. Я лічу, што руская літаратура — вялікая літаратура. І чаго там толькі няма, тым больш у XX стагоддзі. Але сучасная руская літаратура, у якой прысутнічаюць Лімонавы, Прахананавы, Прылепіны... Ведаеце, для мяне гэта проста «дзіч».

***— Чаму?***

— Таму што яны здрадзілі гуманістычным каштоўнасцям, гуманізму. Я лічу, што ў літаратуры павінен прысутнічаць менавіта гуманізм. І таму ў сучаснай літаратуры я вылучаю сваіх сяброў. Напрыклад, метаметафарысты Паршчыкаў і Яроменка. Яны перакладалі мае вершы на рускую мову і зрабілі гэта добра, я іх паважаю. Усе вялікія рускія часопісы, такія як «Новый мир», «Дружба народов», «Литературная учеба», надрукавалі мае вершы. Асабліва здзівіла, што «Наш современник», напэўна, самы кансерватыўны рускі часопіс, таксама мяне надрукаваў. І таму я вельмі, па-руску кажучы, «трогательно» стаўлюся да сваіх перакладчыкаў.

А, напрыклад, паэта Аляксандра Яроменку я лічу геніем сучаснай рускай паэзіі:

*В густых металлургических лесах,*
*где шел процесс создания хлорофилла,*
*сорвался лист. Уж осень наступила*
*в густых металлургических лесах.*

Дзякуй Богу, што ён жыве. Праўда, у хоспісе...

***— А што датычыцца сучаснай беларускай літаратуры... Каго вылучаеце?***

— Каму я даваў сваю прэмію «Залатая літара», таго і вылучаю: Андрэй Федарэнка, Альгерд Бахарэвіч, Андрусь Горват.

***— Чаго не хапае маладым беларускім літаратарам?***

— Грошай. Ведаеце, гэта добры адказ. У грошай ёсць сутнасць: іх заўсёды не хапае. Вось вы спытайце, і ўсе пісьменнікі вам адкажуць: «Мы ж бедныя, а ганарары маленькія». Людзі (пісьменнікі не выключэнне) верачь у грошы. Маўляў, будуць грошы, і яны адразу ўсё напішуць.

***— Але я, хутчэй, мела на ўвазе адмоўныя тэндэнцыі. Ці ў нас усё добра ў сучасным беларускім літаратурным працэсе?***

— Ну пры ўмове, што мы атрымалі Нобелеўскую прэмію?

Я лічу, што, напрыклад, Салжаніцын атрымаў прэмію за Дастаеўскага. «Запіскі з мёртвага дома» — жудасны твор, напісаны Дастаеўскім. Калі японскі пісьменнік Акутагава яго прачытаў, то ён сказаў, што такой фантазіі няма ні ў аднаго японца. Ён не здагадаўся, што гэта гіперрэалістычны твор напісаны з натуры. Але Дастаеўскі ў выніку розных абставіны, не мог атрымаць таго сусветнага прызнання, якое атрымаў Салжаніцын. А Салжаніцын такога па якасці твора стварыць не змог. Ён проста пераказаў Дастаеўскага для больш нізкага ўзроўню, затое для больш шырокай публікі.

Таму я лічу, што Святлана Алексіевіч атрымала прэмію за Брыля, Калесніка, Адамовіча, якія прыдумалі жанр магнітафоннай літаратуры. Дакументальную фіксацыю, як у творы «Я з вогненнай вёскі». Калі аўтары пісалі гэтую кніжку, мой бацька, Вячаслаў Адамчык, працаваў рэдактарам. Трэба было адрэдагаваць матэрыял такім чынам, каб, напрыклад, узмацніць мову Адамовіча або дадаць больш фактаў у часткі, якія пісаў Брыль. Трэба было ўсё гэта зрабіць роўна, таму бацька сядзеў і перапісваў. То-бок я быў сведкам стварэння гэтай літаратуры. Адамовічу і Брылю проста не хапіла часу да Нобелеўскай прэміі. За іх яе атрымала Алексіевіч. Увогуле, за ўсю літаратуру нашай Беларусі.

***— Ці шкодзіць беларускай культуры раз'яднанасць паміж літаратарамі, мастакамі, рэжысёрамі?***

— Я лічу, што ўсё добра *(смяецца)*. Я вучыўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце, і заўсёды ў нас быў канфлікт паміж мастакамі і артыстамі. Таму што артыст — гэта чалавек, які трымае паўзу. А мастак — гэта той, які гаворыць хутка і трымае рытм. Ну вось нарадзіліся мы такія: адны трымаюць паўзу, а іншыя — рытм. Мы ўсе розныя, не трэба нас змешваць.

***— У адным з інтэрв'ю ў вас пацікавіліся наконт Беларускага свабоднага тэатра. І вы адказалі даволі сцісла. Ці змяніліся вашыя меркаванні?***

— Іду па праспекце, сустракаю кіраўніка згаданага тэатра Колю Халезіна, ён мне кажа: «Слухай, у мяне ёсць магчымасць прывезці любога чалавека з замежжа ў Мінск. Вось каго назавеш, таго і запрашу». Я адказваю: «Ёсць такі драматург Том Стопард. Ты яго прывязі». Праходзіць час, мне тэлефануе Коля: «Я тут Стопарда прывёз. Ты прыйдзі з ім пагаварыць». — «А чаму я павінен з ім размаўляць?» — «Таму што ты павінен паказаць, якія мы разумныя».

Гэта адзіны раз, калі я быў у Свабодным тэатры: пагаварыць са Стопардам ды паказаць, якія мы разумныя. Я прыйшоў, мне Коля кажа: "Задавай сваё пытанне». Ну я і задаў. А Стопард тады ў мяне пытаецца: «Слухайце, а вы бераце грошы за свае пытанні?» — «Бывае, але зараз абсалютна бясплатна».

«Я адкажу на пытанне, але я здзівіўся, што вас гэта так хвалюе. Пытанне вымушае мяне чырванець».

А пытанне было такое: «Вы геніяльны драматург. І вы павінны распавесці гісторыю. У вас ёсць два артысты: Арлекін і П'еро. Праз каго вы будзеце расказваць гісторыю?»

Стопард абурыўся таму, што ён, постмадэрніст, павінен рабіць выбар. Я разбурыў сістэму каштоўнасцяў, прымусіў яго казаць, што Арлекін лепшы за П'еро. А ён як сапраўдны постмадэрніст павінен быў адказаць: «Ды мне ўсё адно».

***— Якія культурныя мерапрыемствы, што адбываюцца ў Мінску, падаюцца вам найбольш цікавымі?***

— На сённяшні дзень я са сваімі студэнтамі пайшоў бы ў Нацыянальны мастацкі музей, чытаць лекцыю, напрыклад, пра Жукоўскага. Таму што зараз такі хуткі, зменлівы і багаты на падзеі час, што хочацца мудрасці і цішыні.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: **Совместное общество с ограниченной ответственностью «Центральная продовольственная компания» (СООО «ЦПК»),** УНП 690576472, дело № 118-11Б/2020, Экономический суд г. Минска в лице антикризисного управляющего ИП Колотиловой Т.А., тел. +375 (29) 550-94-84.

Электронные торги в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **21 декабря 2020 г. 09.00–16.00** на электронной торговой площадке BELTORGI.BY.

| № п/п | Лот № | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб., без НДС | Минимальная цена предмета торгов, бел. руб., без НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 13176 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 BELAVA-02, рег. знак АК 6274-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049143 X96330900B1001229, цвет – белый | 7 000,00 | 6 930,00 |
| 2 | 13177 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 BELAVA-02, рег. знак АК 6273-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049145 X96330900B0999016, цвет – белый | 7 000,00 | 6 930,00 |
| 3 | 13178 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 BELAVA-02, рег. знак АК 9996-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049115 330900B0995742, цвет – белый | 5 200,00 | 5 148,00 |
| 4 | 13179 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 BELAVA-02, рег. знак АК 3360-5, 2011 г. в., кузов (рама) № Y39850000B0049125 330900B0998233, цвет – белый | 6 100,00 | 6 039,00 |
| 5 | 13180 | Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак АМ 3270-5, 2012 г. в., кузов (рама) № Y3H473800C0062721 X96330900C1023587, цвет – белый | 7 900,00 | 7 821,00 |
| 6 | 13181 | Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак АМ 3271-5, 2012 г. в., кузов (рама) № Y3H473800C0062795 X96330900C1023568, цвет – белый | 7 900,00 | 7 821,00 |
| 7 | 13182 | Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 BELAVA, рег. знак АМ 8987-5, 2013 г. в., кузов (рама) № 330900D1033192 Y39330900D0106089, цвет – белый | 7 900,00 | 7 821,00 |
| 8 | 13183 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 «BELAVA», рег. знак АМ 9089-5, 2013 г. в., кузов (рама) № Y39330900D0106088 330900D1033264, цвет – белый | 7 900,00 | 7 821,00 |
| 9 | 13184 | Грузовой фургон изотермический GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак АН 8793-5, 2013 г. в., кузов (рама) № Y39330900D0106065 X96330900C1026126, цвет – белый | 7 900,00 | 7 821,00 |
| 10 | 13185 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак АО 2537-5, 2014 г. в., кузов (рама) № Y3H473800E0067659 X96330900E1048325, цвет – белый | 7 100,00 | 7 029,00 |
| 11 | 13186 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак АО 2536-5, 2014 г. в., кузов (рама) № Y3H473800E0067658 X96330900E1048368, цвет – белый | 9 200,00 | 9 108,00 |
| 12 | 13187 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак АО 2538-5, 2014 г. в., кузов (рама) № Y3H473800E0067660 X96330900E1048360, цвет – белый | 9 200,00 | 9 108,00 |
| 13 | 13188 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ-3309 KUPAVA-473800, рег. знак АО 2594-5, 2014 г. в., кузов (рама) № Y3H473800E0067812 X96330900E1048320, цвет – белый | 9 200,00 | 9 108,00 |
| 14 | 13189 | Седельный тягач Renault Premium 410, рег. знак АО 2767-5, 2008 г. в., кузов (рама) № VF624GPA000015144, цвет – белый | 31 000,00 | 30 690,00 |
| 15 | 13190 | Седельный тягач Renault Premium 410, рег. знак АН 1925-5, 2008 г. в., кузов (рама) № VF624GRA000016832, цвет – белый | 31 000,00 | 30 690,00 |
| 16 | 13191 | Седельный тягач MAN TGX 18.440 рег. знак АО 4493-5, 2012 г. в., кузов (рама) № WMA06XZZXCW173909, цвет – оранжевый | 58 900,00 | 58 311,00 |
| 17 | 13192 | Полуприцеп фургон-рефрижератор Krone SDP 27, рег. знак А 6920 В-5, 2004 г. в., кузов (рама) № WKESDR27041215277, цвет – зеленый | 17 900,00 | 17 721,00 |
| 18 | 13193 | Полуприцеп фургон-рефрижератор Montracon рег. знак А 4715 В-5, 2005 г. в., 23305, цвет – бело-синий | 17 600,00 | 17 424,00 |
| 19 | 13194 | Полуприцеп фургон-рефрижератор Montracon, рег. знак А 4714 В-5, 2005 г. в., кузов (рама) № 23308, цвет – бело-синий | 17 600,00 | 17 424,00 |
| 20 | 13195 | Грузовой фургон-рефрижератор MAN TGA 26.410, рег. знак АО 5455-5, 2003 г. в., кузов (рама) № WMAH20ZZZ4M374264, цвет – синий | 35 900,00 | 35 541,00 |
| 21 | 13196 | Грузовой фургон-рефрижератор Mercedes-Benz Atego 815, рег. знак АН 7133-5, 1999 г. в., кузов (рама) № WDB9702121K458947, цвет – бело-синий | 16 400,00 | 16 236,00 |
| 22 | 13197 | Грузовой фургон-рефрижератор Mercedes-Benz Atego 918, рег. знак АН 7541-5, 2003 г. в., кузов (рама) № WDB9700351K889047, цвет – белый | 24 000,00 | 23 760,00 |
| 23 | 13198 | Грузовой фургон-рефрижератор Mercedes-Benz Atego 818, рег. знак АН 6820-5, 2004 г. в., кузов (рама) № WDB9702121K962233, цвет – белый | 24 000,00 | 23 760,00 |
| 24 | 13199 | Грузовой фургон-рефрижератор Mercedes-Benz Atego 815, рег. знак АН 8451-5, 2005 г. в., кузов (рама) № WDB9700131L014976, цвет – белый | 26 700,00 | 26 433,00 |
| 25 | 13200 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ – C41R33 KUPAVA 47N800, рег. знак АО 6611-5, 2014 г. в., кузов (рама) № Y3H47N800F0068792 X96C41R33F1057875, цвет – серебристый | 29 800,00 | 29 502,00 |
| 26 | 13201 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ – C41R33 BELAVA-1522, рег. знак АР 0541-5, 2015 г. в., кузов (рама) № Y39152200F0094005 X96C41R33F1064114, цвет – серебристый | 32 700,00 | 32 373,00 |
| 27 | 13202 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ – C41R33 KUPAVA 47N800, рег. знак АО 6740-5, 2015 г. в., кузов (рама) № Y3H47N800F0069180 X96C41R33F1059414, цвет – серебристый | 32 800,00 | 32 472,00 |
| 28 | 13203 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ C41R13 KUPAVA 47N800, рег. знак АС 1047-5, 2018 г. в., кузов (рама) № Y3H47N800J0073119 X96C41R13J1093858, цвет – белый | 38 200,00 | 37 818,00 |
| 29 | 13204 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ C41R13 KUPAVA 47N800, рег. знак АТ 4067-7, 2018 г. в., кузов (рама) № Y3H47N800J0073172 X96C41R13J1093857, цвет – белый | 38 200,00 | 37 818,00 |
| 30 | 13205 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ C41R13 KUPAVA 47N800, рег. знак АТ 4023-7, 2018 г. в., кузов (рама) № Y3H47N800J0073174 X96C41R13J1093848, цвет – белый | 38 200,00 | 37 818,00 |
| 31 | 13206 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ – C41R13 KUPAVA 47N800, рег. знак АТ 4024-7, 2018 г. в., кузов (рама) № Y3H47N800J0073173 X96C41R13J1093853, цвет белый | 38 200,00 | 37 818,00 |
| 32 | 13207 | Грузовой фургон-рефрижератор GAZ – C41R33 KUPAVA 47N800, рег. знак АС 8693-5, 2018 г. в., кузов (рама) № Y3H47N800J0074190 X96C41R33J1100056, цвет – белый | 38 800,00 | 38 412,00 |
| 33 | 13208 | Машина для нарезки сыра STORM | 15 300,00 | 15147 |
| 34 | 13209 | Настольные весы Espera ES 2012 | 9 700,00 | 9603 |
| 35 | 13210 | Погрузчик электрический TCM с зарядным устройством Япония | 19 800,00 | 19602 |
| 36 | 13211 | Поломоечная машина COMAC L 22B CB Италия | 3 000,00 | 2970 |
| 37 | 13212 | Самоходный электрический штабелер | 5 000,00 | 4950 |

**Местонахождение: п. 1-32 – Минская обл., Узденский р-н, аг. Слобода, п. 33-37 – Минский р-н, аг. Сеница. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

